Новы Час | 25 чэрвеня 2021 | № 24 (732) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №6

Літаратурная Беларусь

Выпуск №6 (178)
(чэрвень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Ліст да Вітольда Ашурка



Фота www.onliner.by

Прывітанне, дарагі Вітольд!

Я быў у ад'ездзе, калі прыйшоў ад цябе ліст з месца твайго зняволення. Мне паведамілі пра тое па тэлефоне. Я падумаў, што адпішу табе адразу, як вярнуся дахаты. Я заўсёды адказваю на лісты. Ты ж ведаеш. А пасля прыйшла жудасная трагічная навіна пра тое, што смерць забрала цябе ў Шклоўскай калоніі, дзе ты адбываў няволю. Цяжка было ў тое паверыць. Цяжка было па вяртанні дахаты разгарнуць твой апошні ліст ужо пасля таго, як не стала таго, хто яго напісаў. Цяжка адпісваць на той ліст, бо сэрца абліваецца крывёй і мае ўжо не маладыя вочы, якія пабачылі многа чаго ў жыцці, наліваюцца слязамі – як у малога дашкаляці. Але я мушу адпісаць на твой ліст. Я заўсёды адказваю на лісты. Ты ж ведаеш.

Цяпер гляджу на твой прыгожы почырк, на гэтыя старанна і з павагай да чытача выведзеныя літары і ўспамінаю, што ты і сам быў такі ж шляхетны, годны, прыстойны, заўсёды ставіўся з павагай да суразмоўцы, да кожнага чалавека... Культурны, сціплы, з арыстакратычнымі паводзінамі, якія былі ў тваёй крыві, у генах, у манерах... Заўсёды акуратны, статны, праўдзівы, стойкі, смелы...

У мяне то почырк паганы, таму я табе заўсёды «пісаў» на кампутары, каб лягчэй чыталася. Я так пісаў і Алесю Бяляцкаму ў турму, і Паўлу Севярынцу, і іншым палітвязням. Бо ведаю, што такім людзям шмат суайчыннікаў пішуць, і лепш, калі чытаецца лёгка.

Дарэчы, ад Паўла Севярынца ліст да мяне прыйшоў амаль адначасна з тваім. Мы з ім гэтак жа, як і з табой, часта разважаем пра непарыўнасць беларускай місіі ў вечнасці і пра адраджэнне беларускасці і нашай нацыі. І ведаеш, я хачу падзяліцца з табой некаторымі ягонымі падлікамі. Табе гэта будзе вельмі цікава. Павал паведамляе пра вынікі своеасаблівай статыстыкі, праведзенай ім паводле атрыманых у зняволенні лістоў. 71 адсотак – гэта беларускамоўныя лісты. Раней гэты адсотак быў меншы. А самы вялікі працэнт беларускамоўных лістоў прыходзіць акурат з тваёй любай Гарадзеншчыны. 82 адсоткі. Амаль усе! Вось, Вітольд, гэта і ёсць адзін з вынікаў тваёй працы на ніве Беларускага Адраджэння. Твае высілкі не прапалі дарма. І не толькі ў гэтым кірунку.

Ты пішаш, што цябе вельмі ўражвае повязь пакаленняў, калі нашы продкі, мы і нашы нашчадкі ёсць адзінай нацыяй, якая існуе па-за межамі лінейнага часу. Ты сцвярджаеш у сваім лісце так: «...Калі мы існуем у мінулым часе, сёння і ў будучыні, то мы практычна бессмяротныя! Ад гэтай думкі проста немагчыма пазбавіцца! Гэты містычны ланцужок з мінулага ў будучыню цяпер трымаем у сваіх руках мы, і на нас ляжыць адказнасць за тое, што мы перададзім ў спадчыну нашчадкам!...».

Дарагі сябра! Ты з годнасцю перадаў нашчадкам усю вялікую спадчыну нашых продкаў. Цябе, Вітольд, нашы славутыя продкі выбралі для гэтай місіі, бо ведалі, што ты не падвядзеш. І ты не падвёў. Тваё Імя ўжо стала сімвалам для беларускіх патрыётаў. Для людзей, што ідуць шляхамі праўды і справядлівасці. Неўзабаве тваім Імем будуць названыя вуліцы ў розных гарадах нашай краіны, па якіх табе давялося прайсці, а людзі будуць прыносіць кветкі да выбітага ў золаце твайго Прозвішча. Нашчадкі будуць ганарыцца тым, што ў нашым народзе нараджаюцца такія Людзі, як ты. Так, як і ты ўсё жыццё ганарыўся сваім Народам, яго лепшымі дочкамі і сынамі.

Ты і сам згадваеш пра веліч свайго народа ў гэтым лісце. Ты сцвярджаеш: «...Гэта натхняе! Гэта абуджае ў нас усё самае светлае і дае надзею, што мы выканаем тое, што нам наканавана лёсам – мы Пераможам!...».

І яшчэ ты самаахвярна напісаў: «...Ведаеш, шаноўны сябра, у параўнанні з гэтым лёсавызначальным працэсам маё становішча зараз не мае істотнага значэння»...

Дарагі сябра. Гэтыя словы ўсё гавораць пра цябе. Свет, які ад іх зыходзіць, застаўся тут. А ты пайшоў у іншы Свет, куды некалі прыйдуць усе. Там няма канкрэтнага адрасу, як на Зямлі. Таму гэты ліст я адпраўляю табе праз сваю любімую газету. Яна заўсёды выходзіла па-беларуску, таму ўпэўнены, што ты і Адтуль заўважыш і яе, і гэты ліст.

Заканчваю так, як і ты заканчваў кожны свой ліст да мяне. Думаю, што і не толькі да мяне. Словамі – «Жыве Беларусь!!!»

З павагай да цябе,

Віктар САЗОНАЎ

Пра небяспечную кнігу

...У жыхаркі Калодзішчаў канфіскавалі кнігу Святланы Алексіевіч. Удумайцеся толькі: у XXI стагоддзі ў цэнтры Еўропы ў беларускі канфіскуюць кнігу нобелеўскай лаўрэаткі! Яшчэ троху, і на вуліцах пачнуць паліць небяспечныя кнігі.

Жыхарку Калодзішчаў затрымалі па дарозе на працу. І разам з ёй паехалі для правядзенняператрусу, падчас якога ў яе канфіскавалі тэхніку і тэхніку яе мужа.Ператрус праводзілі з той нагоды, што нібыта жанчына развешвала бел-чырвона-белыя стужкі на дрэвах. Дома ў жанчыны канфіскавалі знойдзеныя бел-чырвона-белыя стужкі. А таксама кнігу Святланы Алексіевіч...

А цяпер пытанне: дзе логіка? Добра. Былі дзесьці там на вуліцы стужкі. Але ж не кнігі там віселі. А калі нават і кнігі. І калі гэта нобелеўскі лаўрэат Святлана Алексіевіч стала забароненай у Беларусі? Ці цяпер дома можна мець толькі кнігі Чаргінца?

У Беларусі былі выпадкі, калі канфіскоўвалі сцягі іншых краін, паколькі яны мелі чырвоную і белую афарбоўку, калі арыштоўвалі за тое, што на балконе ляжала скрыня з-пад тэлевізара белага і чырвонага колераў. У Мінску нават судзілі жанчын, якія чыталі кнігі па-беларуску ў электрычцы. Але каб дома канфіскавалі кнігу нобелеўскага лаўрэата – такое ўпершыню...

Кожны раз пасля пэўных падзей думаеш, што горш не бывае. А потым глядзіш і разумееш, што, аказваецца, бывае.

Юлія СІВЕЦ

Аляксей РАГУЛЯ

Сваім — пра сваё

Штрыхі да літаратурнага партрэта Янкі НЁМАНСКАГА

Быў час, калі пра кожнага выдатнага дзеяча беларускага адраджэння пачатку XX стагоддзя было прынята гаварыць: належыць да пакалення, народжанага Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыяй, якая адкрыла перад ім шырокія ідэйныя і творчыя гарызонты.



Містыфікаваная формула прыадкрывала нейкую магчымасць пасмяротнай рэабілітацыі ахвяраў бальшавіцкага тэрору, вінаватых хіба толькі ў тым, што яны былі таленавітымі і актыўнымі дзеячамі нацыянальнага адраджэння.

Такім быў і вучоны, дзяржаўны дзеяч Іван Андрэевіч Пятровіч — пісьменнік Янка Нёманскі (нарадзіўся 12 красавіка 1890 года, расстраляны 30 кастрычніка 1937-га). Нарадзіўся ён у Шчорсах (Навагрудчына) у сялянскай сям'і. Маці памерла вельмі рана, гадаваўся і рос Янка пад апекай бацькі і дзеда. Сялянская праца, народная мараль і этыка сфармавалі яго светапогляд, умацавалі прыродны віталізм і прагу жыццядзеяння на карысць сабе і людзям.

Янка Нёманскі пачынаў мастацкае даследаванне з пазіцый "крытычнага аптымізму" — з ацэнкі сацыятворчага патэнцыялу беларускага "дна". Такая пазіцыя выключала магчымасць харызматычнай ідэалізацыі бальшавіцкіх камісараў. Служба ў Чырвонай Арміі і ў дзяржаўных установах забяспечыла пісьменніка веданнем, неабходным для таго, каб паказаць нежыццёвасць і ненатуральнасць рэвалюцыянарысцкай ідэалогіі, маральны крах яе носбітаў, каб вызначыць арыенціры гуманітарнай адукацыі і асветніцкай працы...

Янка Нёманскі ішоў у літаратары побач з тымі, хто выкрываў імперскія байкі пра няздатнасць беларускай нацыі да самастойнага палітычнага жыцця. Ён паказваў працэс фарміравання палітычнага лідэра ў нетрах чорнага бяздоння, у якое беларускі народ быў кінуты няпрошанымі апекунамі. Адначасова ён выкрываў "тутэйшых" — пярэваратняў і прыслужнікаў, якія забяспечваюць уладатрымальнікам панаванне над народам, выконваючы функцыі панскіх гайдукоў і цівуноў.

Праблема нацыянальна-этнічнай кансалідацыі беларусаў вырашаецца ў трагедыйным каноне ў апавяданьні "Рамэа і Джульета на Беларусі". Ясь і Алеся пераканалі сваіх бацькоў, што прыналежнасць да розных канфесіяў не з'яўляецца перашкодай для шлюбу закаханых. Аднак на заручынах, у момант, здавалася, вышэйшага паразумення паміж бакамі раптоўны выбух узаемнай нянавісці стаў развязкай ідыліі і завязкай трагедыі.

Ідэалагічная сутычка імперскіх сілаў Захаду і Усходу на беларускай прасторы ў пачатку XX ст. вылілася ў крывавую бойню. Яе вынікам была Рыжская дамова 1921 года. Праведзеная без удзелу беларусаў, яна разарвала Бацькаўшчыну на дзве часткі. Заходняя стала Крэсамі Усходнімі адроджанай на імперскі манер Рэчы Паспалітай Польскай, а Усходняй Беларусі бальшавікі вымушаны былі надаць статус саюзнай рэспублікі. Лёс народа вырашалі людзі прышлыя, чужыя. Пад прыкрыццём дэмакратычнага вэлюму пераможцы імкліва будавалі дыктатарскія рэжымы. Афіцыйная ідэалогія ў абодвух выпадках прадугледжвала ліквідацыю беларускай культуры.

Сітуацыя "на зломе" яскрава адлюстраваная ў апавяданнях Янкі Нёманскага 1923 года "Дэзэрцір" і "Маці". У 1930-м кніга прозы Янкі Нёманскага выйшла на рускай мове ў Ленінградзе. Яе загаловак дакладна адлюстроўвае сутнасць зместу: "На изломе". Празаік быў адным з пачынальнікаў метаду "крытычнага аптымізму" ў беларускай літаратуры XX стагоддзя, адным з заснавальнікаў беларускага суровага стылю.

У апавяданні "Дэзэрцір" ён паказаў, што беларускаму народу нясуць пагібель і бальшавікі, і пілсудчыкі. Народ у творы — гэта салдаты двух батальёнаў Чырвонай Арміі і сяляне беларускай вёскі, захопленай легіянерамі. Галодныя і абмарожаныя салдаты ў ранішнім змроку былі кінуты ў атаку. Сустрэтыя кулямётным і мінамётным агнём белых, яны ў большасці сваёй засталіся ляжаць расшкуматаныя на скрываўленым снезе. Перад атакай камандзір узвода вучыў, што "перамога той, хто не толькі зможа свайго супраціўніка, але і пакорыць гэтыя прыродныя ўмовы". Салдацкія пытанні, як іх перамагчы, "калі ў такі мароз мы ходзім у брызентавых шынялях ды гамашах", як страляць, "калі на дваццаціградусным марозе ў мяне рукі голыя", — засталіся без адказу. Не было адказу і на галоўнае пытанне: "Вайна? Дзеля чаго яна?"...

Творчая інтэлігенцыя павінна стварыць духоўны грунт нацыянальнай кансалідацыі — зрабіць здабыткам грамадскай свядомасці гістарычны вопыт нацыі. Абавязак палітычнай інтэлігенцыі — стварэнне сацыяльных умоў, неабходных для мэтанакіраванай асветніцкай працы

...Васіль Каляда быў на фронце з часу нямецкай вайны. Ён не бачыў сэнсу ні ў войнах, ні ў рэвалюцыях. Яго мужыцкі ідэал — гэта толькі трызненне ў паўсне пра каня, луг, сена, жонку Кацярыну, малога сына Юзіка. Васіль стаў дэзерцірам і нарэшце дайшоў да сваёй вёскі, якую захапілі польскія легіянеры. Адзін з іх стаў гаспадаром у Васілёвай хаце. Спаласаваная шампаламі Кацярына "страціла ўсякую надзею": "Толькі дзеля Юзіка я засталася жывою і не налажыла на сябе рук". Апошняе слова ў спрэчцы было за сякерай: "і пакуль жаўнер справіўся ўстаць, яна сваім вастрыём глыбока ўрэзалася яму ў голаў...". Цяпер Васіль ведаў, дзеля чаго ён ідзе ваяваць: "Спагнаць помсту!". Калі ж ён вярнуўся пасля выгнання палякаў, то замест хаты ўбачыў папялішча. Пра жонку і сына Васілю сказала праўду суседка: пасля катаванняў іх застрэлілі, хату падпалілі. Васіль пасля гэтага страціў цікавасць да жыцця: "Апошняя іскарка, астатні праменьчык у душы Васіля затухлі. У жыцці яго не асталося больш ніякага пачуцця, апроч прагнасці да помсты"...

Янка Нёманскі з першых крокаў у літаратуры адчуваў неабходнасць самастойнага выбару: белетрызаваная ілюстрацыя догмы ці разгортванне і развіццё ідэі на аснове аналізу праблемы агульначалавечай значымасці. Такой была для яго праблема-ідэя станаўлення беларускай нацыі ў якасці суб'екта гісторыі, рух з цемры да святла. Паэтыка яго апавяданняў пабудавана на аснове высвечвання і выхоплівання з цемры асобных фігур і лёсаў, якія ў сваю чаргу і фарміруюць ідэю: прычынай чалавечай трагедыі ў Беларусі з'яўляецца адсутнасць сваёй інтэлігенцыі, маральна і інтэлектуальна падрыхтаванай да выканання свайго абавязку — кіраўнічай дзейнасці ў розных сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

Новыя аспекты народнай тэмы вымагалі і новай структуры. Матыў змагання за сцверджанне свайго права на годнае жыццё дыктаваў патрэбу ў культурным героі. Янка Нёманскі не мог і не хацеў карыстацца сурагатамі ды ідэалагічнымі шаблонамі. Не парушаючы логікі ідэі станаўлення, пісьменнік выводзіць нас за межы "простага пераймання існай рэчаіснасці" і плаўна пераключае стыль сацыяльна-бытавога пісьма ў напалову казачную нарацыю. Беларуская казка ў гэтым сэнсе валодае неацэнным вопытам. Менавіта на гэтым напрамку з'явілася ў беларускай прозе галерэя мадыфікацыяў Удовінага Сына і Разумнай Дачкі: Сцёпка, Аленка, Сымон, Ганна, Міколка-паравоз... Сярод іх і юны шукальнік праўды Тодар Базылёнак, сын удавы Агаты з аднайменнага апавядання Янкі Нёманскага.

Раман "Драпежнікі" (1928–1930), калі меркаваць па эпічным размаху яго структуры, мог быць пачаткам вялікай хронікі народнага быцця. Ён стаў раманам-папярэджаннем аб немінучай катастрофе на тым шляху, які выбралі бальшавікі. Праблема "свайго" чалавека, такая трагічна напружаная ў прозе Васіля Быкава, у творчасці Янкі Нёманскага трактуецца ўжо як трагічная памылка выбару. Пісьменнік напрыканцы 20-х гадоў даводзіў грамадскасці логікай мастацкага сінтэзу неабходнасць выхавання сваёй, патрыятычна арыентаванай палітычнай інтэлігенцыі. Яе прызначэнне не ў тым, каб камандаваць ці даваць устаноўкі. Творчая інтэлігенцыя павінна стварыць духоўны грунт нацыянальнай кансалідацыі — зрабіць здабыткам грамадскай свядомасці гістарычны вопыт нацыі. Абавязак палітычнай інтэлігенцыі — стварэнне сацыяльных умоў, неабходных для мэтанакіраванай асветніцкай працы. У другой палове XIX стагоддзя ў беларускай, польскай і рускай літаратурах значнае месца займаюць матывы дэградацыі і выраджэння пануючых класаў. Ідэалы герояў 1863 года былі забытыя, спаланізаванае вяльможнае панства пагадзілася са стратай свайго ўплывовага становішча ў былой Рэчы Паспалітай. Клопат пра кар'еру, пра ўласныя фабрыкі і даходы з маёнткаў быў на першым месцы. У ахвяру была прынесеная мова, годнасць, гонар, мараль і народ.

Янка Нёманскі паказвае маральнае выраджэнне арыстакратыі. Яго цікавіць найперш духоўная культура. У рамане першае знаёмства з персанажамі пачынаецца з апісання архітэктурнага стылю будынкаў, інтэр'еру і літаратуры, якой яны цікавяцца. Новае пакаленне Друцкіх і Ляскоўскіх аддае перавагу Пшыбышэўскаму і Арцыбашаву, іх прыхільнасці да маральнай эклектыкі і свабоды ад культурнага табуіравання. Малады гаспадар Ляскаўцаў і князёўна шалёна шукаюць вострых адчуванняў і забыцця, не забываючы пры гэтым пра грошы. "Я шукала ў вас не мужа, а мужчыну," — так гучыць прызнанне князёўны. Не хавае цынізму і партнёр: "Ну дык мне патрэбны князёўскі лес, патрэбен Росаш з усімі яго цацкамі". Спустошанне краю, спустошанне чалавечых душ — так можна характарызаваць вынік гаспадарання Ляскоўскіх, Друцкіх і Ліўшыцаў на зямлі, дзе два стагоддзі назад дзейнасць выдатных асветнікаў вызначыла кірунак інтэлектуальнага пошуку не толькі выхадцам з павятовай ці засцянковай шляхты, але і людзям "простага стану". Менавіта дзейнасць асветнікаў абудзіла рамантыкаў, якія адкрылі свету духоўны скарб — хараство "людзей і кветак над Нёманам" (Эліза Ажэшка).

Адарванасць ад нацыянальнага вызваленчага руху, адсутнасць выразных арыентацыяў стала прычынай духоўнага краху юнай Зосі. Заўсёды чулая да пакалечаных і наогул абяздоленых рабочых з гуты Ляскоўскага, яна мроіла пра невядомае ёй прыгожае жыццё ў вялікіх гарадах і не змагла вызначыцца да канца ў адносінах з сястрой Ляскоўскага Ядзяй, з якой вучыліся ў Мінскай гімназіі. Выкшталцоная ж паненка пастаралася дапамагчы брату ператварыць настаўніцкую дачушку і заадно сваю сяброўку ў наложніцу, якую Стась Ляскоўскі абразіў і літаральна з балю выгнаў у марозную цемень...

Гадаваны галечай у беларускай вёсцы Гаўрыла Росяк "рвануўся" да расійскай сацыял-дэмакратыі. Перанасычаная лексікай клопату пра светлую будучыню працоўных, бальшавіцкая прапаганда адводзіла пралетарыяту ролю сусветнага гегемона. Росяк стаў рабочым-металістам, потым — майстрам, дысцыплінаваным партыйцам, паліткатаржанінам. На будаўніцтве паперні пана Ляскоўскага ён быў ужо Паўлам Зыкавым. Тут ён мог нейкі час прабыць самім сабою — абачлівым і ўдумлівым беларусам. Не адчуваючы ціску партыйнай дысцыпліны, Росяк-Зыкаў у складанай сітуацыі знаходзіў пераканаўчыя довады, каб спыніць падпольшчыкаў з "пахмурным тварам", якія заўсёды патрабуюць толькі "рашучых крокаў". Іх не цікавіць, чым напярэдадні зімы закончыцца для рабочых нявыхад на работу і вулічная дэманстрацыя.

Зусім інакшы выгляд мае Зыкаў, калі ён выконвае партыйнае заданне і патрабуе ад актывістаў зараз жа арганізаваць забастоўку гарбароў з майстэрняў Імрота на Ляхаўцы. "Жорстка-насмешлівая", здзеклівая манера зносінаў з таварышамі, якія, рызыкуючы сабой і сям'ёй, хаваюць Зыкава ад жандараў, — гэта стыль партыйнага жыцця камуністаў. Бальшавіцкая тэхналогія ломкі чалавека, паказвае Янка Нёманскі, была ўдасканаленая яшчэ да кастрычніцкага перавароту. Уся атмасфера паседжання бальшавіцкай ячэйкі прасякнутая духам нежыці... На асуджаных без віны на катаргу бацьку і сына Кавальчыкаў партыйны лідэр не лічыў патрэбным звяртаць увагу. Зыкава ж выкінулі на вуліцу ў рукі жандараў. Выкінулі, як Ляскоўскі выкінуў Зоську...

Містыка бальшавіцкага "знаку бяды" ў святле праўды веку паўстае ў рамане "Драпежнікі" Янкі Нёманскага як адна з найбольш змрочных канцэпцый "жыцця дзеля смерці": "и как один умрём в борьбе за это". За партыйную дыктатуру, як паказаў час.

У прозе Янкі Нёманскага абагульнены вопыт крытычнага асэнсавання беларускага шляху да пачатку XX-га стагоддзя. Пісьменнік пераканаўча паказаў, як на змену драпежнікам з п'явачнымі губамі ідуць магільшчыкі з тонкімі касцістымі пальцамі. У такой сітуацыі асабліва востра адчуваецца патрэба ў лідэрах, кроўна блізкіх народу, разумных і дасведчаных...

Друкуецца ў скароце

Будучыня нарадзілася

Вершы з праекта wir.by

***

Кацярына ГЛУХОЎСКАЯ

Выламаныя дзверы,
Дзверы, выбітыя з нагі.
Адзначаю ў памяці,
Здымаю з петляў агі-
ды,
Ды
Пятляю па сходах,
Па гіпакампавай лесвіцы
Ўніз.
Дзверы, што мы пакінулі
Для суседзяў і мінакоў,
Іх адчаю адчыненымі,
Чыімі
Будуць?
У чый дом вядуць?
У чый сад,
Валадарства бязмежнае?
Чыю бяду
Хаваюць у прыцемках,
Чые кветкі
Бароняць ад цемры
На двух нагах,
На сотнях
Гумовых ног?
Кажуць, на чорных содняx
Пінаюць нашыя сэрцы,
Ступаюць на снежнаягаднік,
Слухаюць лускат іх.
Кажуць, што там звяры
Апрануліся ў людзі,
Выйшлі з сябе.
Выйшлі за межы
Закона — і чалавечага,
І не.
Бачу, муры растаюць
І растуць
Стагоддзямі.
Бачу, знаходзяцца
Людзі і дзверы
Зламаныя і адкрытыя.
Вочная, не на веру,
Нязмерная
Розніца паміж імі.


14 жніўня 2020

Калі ласка

Галіна СІЎЧАНКА

«Калі ласка, біце!
Біце мяне па нырках,
у вачніцах маіх гасіце свае недапалкі,
кулямі,
кулямі
рабіце мне ў целе дзіркі
і — куды вам захочацца! —
ўстаўце палкі.
Калі ласка, зламайце мне шыю,
пальцы,
пазваночнік зламайце, ногі...
Спыніце сэрца.
Электрычнасць пусціце ў мозг
праз даўгое джальца,
дайце мне захлынуцца крывёй
ад удару берцам!
Калі ласка...
пастаўце, пастаўце мяне на калені
ля бетоннай сцяны,
ля бяздоннай разрытай ямы.
Так, свабода — гэта нявольніцтва,
рай — глумленне!
Задушыце абрыдлы голас
смуроднай плямы,
калі ласка!..»
— ты ў пекле будзеш прасіць расплаты,
і твайму невыноснаму болю
канца не будзе,
і ніхто не кране,
не кіне цябе за краты,
бо ў пекле — запомні, пагань! —
таксама Людзі!

18 жніўня 2020



Фота Дзмітрыя Дзмітрыева

***

Артур КАМАРОЎСКІ

твая самая чаканая цяжарнасць
напрыканцы лета
пасярод Еўропы
мы чакалі
калі адыдуць воды
гладзілі твой вялікі жывот
сваімі маленькімі рукамі
захіналі ў вялікія сцягі
слухалі
як унутры варушыцца будучыня
і мкнецца ў цяпер
мы баяліся
што яна будзе кволай
што будзе нягеглай
і яе не возьмуць у садок
яна не пойдзе ў школу
як іншыя дзеці Еўропы
што чакае яе замужжа
і нялюбы муж
такі як наш бацька
што яна
самая малодшая ў нашай сям'і
ніколі не зведае шчасця й любові
тым вечарам неба —
наша бабка-павітуха —
надзела чырвонае з белым
каб узяць твой боль
самыя цяжкія твае роды
ты плакала
губляла прытомнасць
ачуньвала
але нараджала будучыню
мы стаялі вакол
усе твае дзеці
а бацька ў шаленстве хапаў нас
збіваў
і кідаў у турмы
ён хацеў і далей валодаць табой
мы трымаліся
трымалі твае вялікія рукі
чакалі
і жнівеньскім вечарам
будучыня нарадзілася жывой
і закрычала

19 жніўня 2020

Інструкцыя па размазванні чалавека

Крысціна БАНДУРЫНА

Ваш галоўны інструмент —
гэта страх.
Страх болю мацнейшы
за сам боль.
Калі вы кіруеце іх страхам,
вы кіруеце імі.
Адбярыце ў іх голас,
прымусьце заткнуцца.
Калі крычаць — біце. Біце мацней
за іх крыкі.
Цемра, чорная ўніформа,
інфармацыйная блакада,
засады ў дварах, выбухі, кулі,
дэзінфармацыя, раскол,
парады спецтэхнікі,
сіняки, пераломы, ЧМТ,
добра б і пару жмуроў —
але не болей,
потым не супакоіце,
што-небудзь «выпадковае»:
самаробная граната,
сардэчная недастатковасць, суіцыд.
Чым болей страху,
тым больш цішыні.
Брацъ усіх.
«Стакан», «баня», расцяжка, карцар,
выпраўленчая праца з дручкамі —
навучыце іх любіць радзіму правільна.
Страх болю мацнейшы за сам боль.
Кожны гіпатэтычны ўдар
больш балючы
за рэальны.
Тэлефоны, тэлеграмы, каналы,
іх сапліўыя перапіскі з мамкамі,
сувязь з арганізатарамі...
Трымайце іх голымі,
палкі з гандонамі напагатове,
калі вы...бваюцца —
пускайце ў ход.
Аніводная сука потым не выйдзе.
Ніякай дапамогі. Ніякай літасці.
Яны нас не пашкадуюць.
Кіньце ім, як сабакам,
кавалак хлеба на ўсіх,
каб перагрызліся.
Піць таксама не давайце.
І трое сутак без парашы —
пагляд зім тады
на абасраных кароў.
А калі выпускаеце —
квітанцыю ў зубы:
хай плацяць
за сваю свабоду,
калі яна была ім патрэбная
такой.

20 жніўня 2020

***

Наста КУДАСАВА

Тут кожны баіцца прызнацца,
што страціў кагосьці,
што больш немагчыма без жаху
ступаць па зямлі:
сасновыя шышкі
трашчаць пад нагамі,
як косці,
як берцы забойцаў, чарнеюць
у травах камлі.
А ў небе — нябесныя сотні,
нябесныя шэсці...
А з неба скрозь слёзы,
абняўшы нябесны штурвал,
глядзіць ашалелы ад роспачы
лётчык Акрэсцін:
«Усё
пазабыта.
Нікога
не
ўратаваў».

20 жніўня 2020

***

Вольга ГРОНСКАЯ

Голас —
парваны ў пыл разам з тонкай паперай,
сарваны болем і немым крыкам,
вырваны з горла дубінкай ка́та,
ператвораны ў галашэнне,
у сіні роспіс на голай спіне —
можа вярнуцца.
Калі ты падымаешся па прыступках
уласнага страху
спяваць пра Пагоню,
калі надзяваеш Пагоню на грудзі
і гуляеш па горадзе,
пагоні не баючыся.
Голас вяртаецца
ў мове тваіх фотаздымкаў,
у словах на ватмане,
гуках ахрыплых клаксонаў,
у хвілінах маўчання.
У запараным кубку гарбаты —
для таго, хто гаворыць.
Голас вяртаецца
новым і моцным,
глыбокім і цвёрдым,
дарослым,
сапраўдным
і болей не будзе ламацца.
Адчуванне гонару,
пачуццё годнасці,
прага праўды і справядлівасці —
найлепшыя ў свеце
фаніятры і
пастаноўшчыкі
Голасу.

24 жніўня 2020

***

Даша БЯЛЬКЕВІЧ

б'юцца ў вокны галінкі дрэваў
зрабі стрэлы
птушкі дзюбай драпаюць шкло
бяры пяро
коціцца ў ногі чорны каменьчык
вастры наканечнік
слухай, я кепска страляю з лука
божа, кожны робіць тое, што можа
мы разам шукаем дарогу,
якая вядзе ўгару
у хвіліны маўчання нараджаюцца ворагі
я гавару

***

Ігар КУЛІКОЎ

насуперак ночы насустрач світанню
праз прошласць шчытоў
як туман цераз тын
мы выйдзем — выходзім —
з самоты й адчаю
на вольны прастор дзе ніхто не адзін
дзе небам валошак заліты далéчы
і тысячы сонцаў расой на траве
як ветразь распраўлены будучым плечы
і ў сэрцах нястомных
жыве Беларусь
жыве

Мама



Уладзімір СЦЯПАН

Раніца

Бярозы за вакном нерухомыя. І крумкач на вершаліне нерухомы, як нежывы. Неба нізкае, дождж усё збіраецца-збіраецца, ды не насмельваецца пайсці. Вусцішна.

З кухні ціха падыходжу да мамінага пакоя, спыняюся ў дзвярах і гляжу на яе твар, потым на сурвэткі на крэсле, на грабеньчык, акуляры, стары тэлефон, на шклянку з вадой, потым зноў на твар і ад яго, слізгануўшы позіркам па гадзінніку, на вялікае вакно — светлае, ранішняе... Сённяшняя ноч прайшла спакойна.

Мама расплюшчвае вочы, здзіўляецца і палохаецца, калі бача мяне ў дзвярах. Я разгублена ўсміхаюся і не ведаю, што сказаць.

— Гэта дзень, сынок?

— Дзень... — адказваю ўпэўнена.

Яна паказвае рукой на сцяну супраць ложка. Там гадзіннік.

— Бяз чвэрці восем. — Кажу, бо думаю, што яе, як заўсёды, цікавіць час.

— Яны прыходзілі, ты не бойся, прысядзь, не стой...

— Хто мог прыходзіць, мы адны, дзверы на замку, нікога тут не было і быць не магло.

— Яны адтуль выйшлі, са сцяны... Цёмныя, высокія такія. Адзін трохі меншы. Я спужалася. Сціснулася ўся ў камяк, а коўдру не магу насунуць... Яны маўчаць і бліжэй падыходзяць. Да самага ложка... Глядзяць і кажуць, каб я збіралася і не баялася. А я сабе думаю, як я з імі пайду, я ж у памперсе, не апранутая... Сорамна...

— Мужчыны, мама?

— Я і не зразумела, хто яны такія. Цёмныя і смяюцца ціхенька...

Падсоўваю да ложка крэсла, сядаю і спрабую ўсміхацца. Хачу ўзяць яе за руку, а яна яе выторгвае, хавае пад коўдру.

— Прыснілася табе абы што... Не думай... Дзень на двары. Снедаць будзем, таблеткі піць... Што прыгатаваць?

— Я, сынок, так даўно жыву, што ўсе свае сны ведаю, не па адным разе сніла... А ты кажаш — сон!

Падымаюся з ложка, падыходжу да сцяны, ляпаю па ёй далонню.

— Не можна з гэтай сцяны выйсці, мама! Бетон!

— Я падумала, ноччу, што калі пайду з імі, то ты раніцай глянеш, а мяне няма... Ложак ёсць, а мяне няма... Спужацца можаш.

— Аўсянку ці амлет?

— Што хочаш...

Калі рабіў амлет, за вакном пайшоў снег. Яйка выслізнула з пальцаў. Упала і не пабілася.

Дзень

Сонечна... У кухні ўсё блішчыць, і старыя рэчы выглядаюць, як новыя. А посуд: талеркі, белыя каструлі, кубкі, лыжкі, відэльцы, шкло — зіхцяць так, што даводзіцца мружыцца.

За вакном, з пятага паверха, відаць далёка: прыватныя дамы і агароды, шаша, чыгунка, высокае неба з белымі аблокамі. На некаторых агародах — блакітна-белы дым. Гаспадары парадкуюць свае соткі, паляць мінулагодняе смецце, абрэзанае галлё.

Думаю пра апавяданне, якое не магу дапісаць, але не злуюся сам на сябе, бо занадта добрае надвор'е, а бярозы, асветленныя красавіцкім сонцам, выглядаюць святочна. Хутка, яшчэ колькі дзён — і рудое галлё зробіцца купароса-зялёным.

Пераношу маму на кухню. Уладкоўваю на цяжкае крэсла побач з жоўтым сервантам. Хачу, каб і яна парадавалася яркаму сонцу, ціўканню птушак, смачным пахам ежы, якая гатуецца на вымытай пліце... А яшчэ думаю пра апавяданне і пра тое, што буду за мамай падглядаць, слухаць за кожным яе рухам, поглядам, лавіць словы і развагі пра жыццё.

Але яна глядзіць у вакно без цікаўнасці.

— Бачыш, дзеці са школы ідуць па дарозе, — кажу ёй.

— Няхай сабе ідуць.

Паварочваю крэсла, і яна не бачыць сонечнага краявіда. Шчоўкаю кнопкамі, кручу тумблер, і пральная машына пачынае вуркатаць, шумець, і за круглым вакенцам радасна круцяцца ў белай пене рознакаляровыя апранахі. Гляджу на радасны рух і вясёлае вуркатанне.

— Доўга яна яшчэ будзе шумець? — Мама паказвае пальцам на белую машыну.

— Паўгадзіны.

— А што так доўга?

— Пакуль намочыць, пакруціць, зноў намочыць, а потым адцісне і спыніцца... Дастану і на балконе павешу — там будзе сонца, і да вечара ўсё пасохне.

— Суп пасаліў? Пасалі...

Салю суп і пачынаю шкадаваць, што прынёс яе на кухню, што выцягнуў са звыклага... Думаў убачыць яе радасць ад усяго гэтага сонечнага, вясёлага, смачнага, шумнага... Спадзяваўся, што ўсё гэта палепшыць яе настрой.

— А які сёння дзень?

— Аўторак.

— Паска скора?

— Трохі меней, чым праз тры тыдні, а што?

— Трэба будзе яйкі пафарбаваць, каб па адным на кожную магілку. Купі, і няхай ляжаць у лядоўні, а то потым... А суп накрый, няхай пастаіць, а то бульба будзе цвёрдая... Занясі мяне туды. — Сказала неяк абыякава і паглядзела на дзверы свайго пакоя.

Перанёс, пасадзіў на ложак і ўздыхнуў.

— Адпачні. — Паляпала па ложку.

Сеў. Маўчым. Думаю, што праз гадзіну трэба палуднаваць, а я пакуль не ўсё прыгатаваў, што кампот забыў пасаладзіць.

— Ма, што-небудзь хочаш?

— Хачу... — Адказвае хутка, як чакала майго пытання.

— Ну?

— Давай разам памром, чуеш?

— ?

— Мы з табой добра пажылі... Чуеш?

— Што ты прыдумала... Што ты гаворыш? Я ж твой сын.

— Сын, я ведаю...

— У мяне ж дачка яшчэ маладая, жонка... Мама, што ўсё гэта? Пра што ты?

— Дачка вялікая, не прападуць яны без цябе...

— Ой... Давай пакладу, паляжы, а то гаворыш абы-што...

Доўга стаю перад вакном, гляджу на аблокі, на белы надпіс упоперак дарогі, добра бачныя тры апошнія літары "ОЛА", а дзве першыя "ШК", амаль сцёрліся коламі машын. Пахне кампотам, але яго салодкі летні водар мяне раздражняе.

Вечар

На клавіятуру ашчадна свеціць маленькая лямпачка. У кватэры цёмна і ціха, нават вусцішна. Спяшаюся, падбіраю словы, быццам выкалупваю, злуюся... У вячэрняй сутонлівай цішыні чуваць кожны гук. Мама ўздыхае, неразборліва мармыча нешта, а потым ясна і насцярожана, амаль спалохана:

— Сынок, Вова, ты дома?!

— Тут, а дзе мне быць, — адказваю, запальваю святло, іду да яе ў пакой.

— Што ты там робіш?

— Працую. Пішу...

— Чытаеш... А што ты пішаш ноччу? Колькі часу? Дзе мае акуляры, не бачу.

— Палова на дванаццатую... Спі! — прашу, ці амаль загадваю і незадаволена ўздыхаю.

— Сядзь тут, раскажы, што ты пішаш, пра што?

— Ой... Пра цябе пішу. — Сказаў і тут жа пашкадаваў, падумаў, што трэба было схлусіць, пра работу што-небудзь расказаць.

Мама насцярожылася, вусны падціснула, рука пачала намацваць акуляры, потым уздзяваць. Павалічаныя шклом вочы злосна, мне так падалося, бліснулі.

— Пра мяне... А што ты пра мяне ведаеш?...

— Пішу пра тое, як мы тут з табой гаруем, як я цябе кармлю, мыю... Пра рознае пішу, а што — нельга?

— Ты толькі не пішы, што бацька твой піў дужа і павесіцца хацеў, а я не дала яму і вяроўку забрала, забіць яго хацела... А ён плакаў-плакаў, як дзіцёнак... Не будзеш гэта пісаць? Напішы, што я ўсё жыццё работала, аж семдзесят восем гадоў работала...

— А чаго ён плакаў?

— Спужаўся...

Трохі памаўчала, акуляры зняла, папрасіла пакласці да месца і пачала расказваць, як памерла яе матка. Памерла ад ціфа, на печы. І дзеці: Вольга, Шура, Надзя і яна, — усе на печы спалі, убачылі, што маці не дыхае, пабеглі на канюшню, каб сказаць бацьку і спытаць, што цяпер рабіць і што ім есці... Бо матка не паспела нічога згатаваць... Напішы, што мой партрэт на прахадной завода вісеў і мне прэміі давалі, а калі ногі пачалі балець, то адпраўдялі ў санаторый — у Сочы, у Сакі, у, забылася, як той горад завецца, — у Анапу...

— Напішу і пра Анапу.

— Што ты тут сядзіш... Ідзі!

— Пісаць?

— Спаць ідзі... А я таблеткі піла? Ідзі... Святло патушы.

Вяртаюся ў свой пакой. Сядаю да стала. Рукі на клавіятуры, але я цяпер не ведаю, пра што пісаць.

Яго малодшы брат

Мы сустрэліся пасля працоўнага дня, побач з былой «Журавінкай», на беразе Свіслачы і стукнуліся кулакамі — павіталіся. Позірк майго даўняга знаёмага быў не вельмі вясёлы. Ён здзёр белую маску, схаваў у кішэнь і паспрабаваў усміхнуцца, але і тут атрымалася не вельмі.

Мы няспешна рушылі ўздоўж ракі.

— Ты сядзеў калі-небудзь за кратамі, цябе арыштоўвалі? — спытаў ён і зірнуў мне ў твар.

— Было неяк, у войску... Завялі на гаўптвахту, але раніцай выпусцілі... А чаго пытаеш?

— А я пражыў сорак тры гады і ніколі не сядзеў у каталажцы, нават не магу згадаць, каб на вуліцы дакументы міліцыя праверыла...

— Гэта «на раз» можна выправіць.

— Уяўляеш, мой малодшы брат... ты яго ведаеш, ты яго бачыў, памятаеш Андрэя?

— Памятаю, ён мяне тады ў шахматы тройчы «зрабіў»... Яму гадоў восем было. Вундэркінд! Што з ім?

— Жывы-здаровы, але за год яго тройчы арыштоўвалі... Ты не здзіўляешся?

— Не.

За мостам грала музыка. Маладзён стаяў перад мікрафонам і спяваў нешта лірычнае і незнаёмае. Моладзь сядзела на зялёным адхоне, слухала, некаторыя падпявалі, парачкі абдымаліся-цалаваліся, смяяліся. Зразумела. Цёплы вечар, прыгожая рака. Любімы горад. Траецкае прадмесце. Шматлюднасць. Адлюстраванні. Калі-нікалі хрушч праляціць. Быццам усё, як заўсёды, толькі размова не вясёлая...

— Андрэй малодшы, а таму і ўся ўвага і любоў яму. Мы насіліся з ім, як з пісанай торбай. Пяці не было, а ён чытаў. Кніжкі — любімыя цацкі. Дачытаўся. У школе па тры разы на год на розныя алімпіяды ездзіў — і, самае галоўнае, перамагаў... Мы з сястрой малодшым братам ганарыліся. Спадзяваліся, што ў яго ёсць усё тое, чаго нам Бог не даў. Здольнасці неверагодныя, а да таго і шанцуе заўсёды...

— Памятаю. Ты хваліўся, дыпломы паказваў...

— У гэты панядзелак ездзілі ў Жодзіна яго сустракаць. Мама не паехала, сказала, што слёзы скончыліся, бацька хацеў з ёй застацца, каб калі што якое, ну сам разумееш... Але мама не пагадзілася, сказала, што і без яго святочны стол збярэ, і з намі яго выправіла. Ён, мы з сястрой і Маша — дзяўчына Андрэя (яны больш за год разам жывуць на здымнай кватэры). Паехалі на маёй машыне. Трывожна. Маўчым. У Мінску навальніца, а за горадам сонца, неба чорна-сіняе і вясёлка... Палі рапсавыя жоўтыя-жоўтыя, трава зялёная — прыгажосць... Атрымалася, што не толькі мы, а яшчэ яго сябры-таварышы на трох машынах да турмы прыехалі. Наш бацька, калі гэта пабачыў — не стрымаўся, слязу пусціў... Ай, што тут казаць, я і сам вочы пачаў церці... Дзве гадзіны чакалі абармота, на сцэны і зялезныя вароты глядзець надакучыла, а яго ўсё няма...

Злева ад крытага катка моладзь веселілася, гуляла ў валейбол, каталася на скейтах, роварах, насілася на самакатах. Калі нам пад ногі прыляцеў мячык, то мой таварыш падхапіў яго і злобна шпурнуў дзяўчыне ў шортах, якая засмялася і пацiснула плячыма.

— Адны за кратамі, а другія скачуць, як быццам усё добра... Як быццам не тут жывуць, а на іншай планеце! — сказаў і спахмурнеў. — Андрэй выйшаў нечакана, адразу пасля нейкіх людзей, якія, відаць, там працуюць — перасменка была. Выйшаў і стаіць, торба ў руках. Высокі, худы... Маша яго заўважыла і першай пазнала. Закрычала, пабегла, і мы за ёй. Андрэй разгубіўся, лыпае, спрабуе засмяяцца... Мне падалося, што не вытрымае — заплача, як дзіцёнак. Тут, каля машын, усе схамянуліся, кінуліся яго карміць. Навезлі ўсяго рознага... А ён адмаўляецца, кажа што там, у камеры, хлопцы засталіся, што там было добра, што і папера, і сурвэткі, і мыла — усё ў іх было... Адно што на вуліцу за трыццаць дзён ні разу не вывелі... Ты сабе не ўяўляеш, як мне захацелася яму ўрэзаць! З усяе моцы. Бо аж зубы павылятаюць... У цябе няма цыгарэты?

— Ты ж не курыш.

— Сем гадоў не курыў, а калі яго другі раз судзілі і далі дваццаць сутак, то не вытрымаў...

— Няма ў мяне цыгарэт, ты ж ведаеш... А як Андрэя ў палітыку занесла, ён жа ўсім гэтым, здаецца не цікавіўся?

— Ведаеш, ён — праграміст. Добра зарабляў. І Маша такая ж, яны з ліцэя знаёмыя... Вандравалі — ляталі-ездзілі куды хацелі. Карацей, жылі сабе і нам на радасць. Кіно да рання маглі з сябрамі глядзець, музыку слухаць... А потым, мінулым летам, брат запісаўся назіральнікам на выбары. Я тады здзівіўся, падумаў, што гэта ўсё фігня нейкая, што няма чым заняцца чалавеку... Мы нават не спрачаліся з ім. Ён сядзеў на тых выбарах, нешта сабе пазначаў у нататніку, моўчкі падлічваў, а потым пачаў спрачацца са старшынёй камісіі. Не сварыўся, а спрачаўся і даводзіў, што лічбы не супадаюць. Выклікалі міліцыю. Андрэй паспрабаваў тлумачыць, але дзе там...

— А што яго сяброўка думае? — спытаў я і спыніўся, пачаў дзівіцца, як рыбак выцягвае блiскучую плотачку.

— Што яна можа думаць... Ёй няма калі думаць — яна валанцёрыць, грошы зарабляе... Слухай, ты б пагаварыў з ім. Нас ён не слухае: ні мяне, ні бацьку, ні сястру... Яны ж з яго могуць інваліда зрабіць...

Мы вярнуліся да былой «Журавінкі», дзе стаяла машына майго сябра, развіталіся. Праз тры дні ён мне патэлефанаваў і сказаў, што Андрэй і Маша сабралі заплечнікі і з'ехалі з Беларусі. Паляцелі ў Грузію, адтуль у Варшаву. Мне падалося, што ён сказаў гэта з палёгкай.

Уваскрашэнне маланкі



Марыя БАДЗЕЙ

***

Такі востры край,
Што з паветра растуць
крыжы і дзядоўнік,
Касцёлы будуюць,
Каб хаваць зброю,
Дзеці гуляюць касцямі
Прайграных паўстанняў.
Край забытых дзвярэй
і забітых шыбаў,
Дысгармоніі рытмаў целаў
І музыкі дрэў.

Пад смыкам птушыным
Дрыжаць палі
нібы пад пальцамі па спіне,
Мочка вуха рыфмуецца з вуснамі,
Як «сонца» з «бясконца»,
І каханне, што ўваходзіць у чалавека,
Як п'яны ў паліто,
Праз белы шум памяці,
Праз белы бэз, што раве ў галаве,
Прарываюцца галасы нашага болю,
Бег
па сератанінавым коле,
Рух
па маршрутах солі,
Страх
перагарэць першым.
Няўжо застаецца толькі горкае?
Няўжо без горкага кроў закісае
І сэрца падае,
Як памідор у гарачы пясок,
Сочыцца залатым семем,
Прыгадвае:
Калі крычыш —
Не забывайся рабіць паўзы.

Я чалавек на балоце тваім
І ведаю:
Там, дзе хаваюць стралу,
Уваскрашаюць маланкі.

***

Краіна — гравюра, выразаная
чыгункамі.
Прысмак жалеза,
Адценні шкла,
Ад цэню ўцякае цягнік.
Шампанскае снежных лясоў!
Гэта зіма Брэйгелем намаляваная
Паверх ксілаграфіі сухімі іголкамі.

Зямлі сцюдзёная патэльня,
Гарачы блін,
што паволі спаўзае за далягляд,
І гарады паміж шахам і патам,
Дзе электрычнасць губляе
свае мандарыны.

Сінія прыцемкі, сонныя злодзеі
З ледзяным лязом за голенем
З лесу вылазяць, палоняць палі,
праглынаюць дарогі.
З вуснаў іх дзьме, з вачэй сочыць,
з рук зорамі пахне,
Так халадзее

І дзень застывае у студзень.

***

Студзень:
Сто дзён
Мне даставаць лёд са студняў,
Штоноч,
Стогнучы,
Нам засынаць у чоўнах
І сэрцы, бы вёдры,
Адно з аднаго цягнуць,
Каб напіцца.

***

Вецце свеціцца белым
У свеце зялёным,
Вецер усім загібелым
Шапоча пра клёны,
Пра арабіны і сосны,
І чэзнуць праклёны,
Цяжар так невыносны
Падае ніц.

Дрэвы ў сон адамкне
Трывогі крыніца,
Створаць з яе люстэрка
Яблыні грому —
Так завостранай гэтай любові
Да страты скарыцца,
Так
Маім навальніцам
З усёй быстрыні
З нябёсаў — у строму.

***

Бэз пахне блюзам,
джаз — язмінам.
Таката хрушчоў
Лёт апякае аб жырандолі
каштанаў.
Рэ мажор у тваіх валасах.
Крычыш.

Гары, чаромха, белым полымем!

***

Першы дзень жніўня.
Вада са студні
Колеру белага вінаграду.
Віно з агрэсту
ад уласных шэптаў
Стае п'янлівым,
Ад гаворкі ў цемры
сабе самому



Фота www.dzedzich.org

Салодкае стаецца садкім.
Досыць трывог.
Увішны Бог
Вішнёвай косткай
упалюе горыч —
Ар'ергард смаку,
І тады
Свет праглыне
ўсю даўкасць арабін,
Глыбіню колеру і крык пладоў,
Якія ўжо з'явіліся з паветра.

***

Шчодры вячор, святы вячор
У срэбры зорных крыг.
Ноч на плячах,
І спеў яе
Аж запірае дых.
Сіпяць вятры, і ты сіпіш,
Шапочуць травы:
што не спіш?
І зорка свеціць услых,
Уверх!
Да хмар!
Дрэў гнуткі рух:
Маленне чары.
Чары рук
На лоб гарачы.
Нарачы
Усё словам. Новыя ключы
Скрыпічныя:
стан нотны — дождж.
На цені ніцыя галін
Мелодыя — агні ялін —
З нябёс сцякае ўначы,
І ноч дрыжыць, бы нож

Над сэрцам вепрука.
Рука
Лье кроў цурком у чорны снег,
Над вепруком саломы смех,
Смалілі — пахі білі з ног,
І пара з місаў, поўны рог,
І ціха плакаў Бог.

Духмень у хаце: хвоя, печ,
Да слова кожнага ёсць рэч,
Цвікі, ягнятка, яйка, трус
Йшчэ абяцаюцца быццю.
Каноплі клалі ў куццю
І сена пад абрус.

Мяло ў Евангеллі палёў,
Мароз куў цішу, а галлё
Пылала срэбрам,
І быццё
Паліла зрэб'е.
З рэбраў дрэў
Плялі кашы гаспадары,
У жніўні каб насіць дары,
Глядзелі, як агонь гарэў,
Увівалі вогненную ніць,
Каб музыку насіць.

Выходзім з кола на прастор
Да зор, і сцежкі збоч.
Такое дзіўнае жыццё,
Дзе снег ідзе ўсю ноч.
Вятрыскі ўзорнае шыццё —
Пасціўся і гавеў,
Між стрэх з аблокамі гібеў
І зоркі слухаў спеў.

***

Ад хмараў вінаграду
цёмна ў хаце,
Словападзенне жніўня
выспявае
У гарачым пыле.
Па-над дахамі спявае
Залаты певень,
Коміны клюе.

Месяц-манарх
уплятае пасмы сонца
У косы цыбулі.
Бульба ў барознах
Бярэ ў разлік раты
і волкасць склепу.
Трывога траў
І дзіўны дрэў давер.

Нічога яўлена ўжо
не будзе.
Усё названа.
У ваду хлеб кідай.
У горле яблык болю
пракаўтнецца.
Даўкім віном
Напоіць месяц-мніх.

***

Хто есць цвілы хлеб —
перуноў не баіцца.
У кожным арэху па маланцы,
У кожным рэху па ліхаманцы,
Слівы, залевай зламаныя,
Рабінавай роспаччу
Ночы на мяжы.
Вецце маланак раве,
Дрэвы ў шыбы рвуцца.

Вятры выціраюць твары
ў люстэрках.
Гістэрыя назваў,
Вязьмо імёнаў,
Словаспады ў вострыя травы,
Марнатраўныя сны
Да сваіх вешчуноў вяртаюцца.

Хата ля лесу,
і сабака брэша на дзверы.

Verbum

О, дзеясловы вербаў,
Сваім узмашыстым «verde!»
Вы адчыняеце дзверы,
І я даяраю: «даруй».

Рэдактар спёкі і залівы
Выправіць словы на слівы,
Абдымкі стануцца дымам —
Цяпер абярнуцца куды нам?

Сэрца — катом у студні
Раве, пакуль не патоне,
Я ў вёдрах тваёй пяшчоты
Зусім захлынуся:
Даруй.

***

Мёд фарбаў, задуха,
Далоні кветак і пах
гэтых далоняў.
Языком па прожылках:
Новымі словамі
Смак старых лёсаў.

На скуры ў кахання пагоны,
Пярсцёнак з каронай
на пальцы,
У кішэні ў злодзея сонца
Са сплячення майго.

Медзь колераў,
крышталь паветра,
Сухая кроў дрэў.
Кулакі пладоў
Вобзем,
Аб клетку грудную,
У сценку.
— Хто там?
— Гэта сэрца ў шыбу.
— Не адчыняй.

Калені



Дар'я ВЯЧЭРКА

Я люблю свае калені.

Калі я была маленькай дзяўчынкай, мае калені заставаліся цэлымі. Яны любілі ровар і ролікі, домікі на дрэве і скакалку. Ніводнай плямачкі ці шнарыка. Мае калені былі светлыя і гладкія. Іх калегі, каленкі іншых дзяцей, фарбаваліся ў смешны зялёны колер ці муміяваліся ў белы бінт.

У мяне прыгожае цела:

1. Вочы колеру цвілі і трошкі марской хвалі;

2. Акуратныя вушы, якія не тырчаць, нібы радыёталеркі;

3. Доўгія худыя пальцы з авальнымі пазногцямі;

4. Круты выгін спіны паміж лапаткамі і копчыкам, які павінен быць у прыгожанькіх дзяўчатак і надае майму целу тыгрычнасць і газельнасць.

Але самыя вабныя застаюцца калені.

Яны круглыя, калі сяджу, калі правая нага зверху налягае на левую, далікатна абдымае яе. Калі ўстаю, яны роўныя, прамыя, не высоўваюцца, як сук. Яны любяць мяккую тканіну спадніцы, цёплыя, часцей гарачыя мужчынскія рукі. На іх утульна дома сядзіць котка, а за дзвярыма кватэры — торба ці заплечнік.

Калені гордыя. Таму я ніколі не стану на калені, што б там ні было.

Летам калені бачаць навакольны сусвет. Яны нагрэтыя сонцам, бурыя ад сонца, падобныя да сонца. Дзве сястры, два маленькія сонцы, якія не схаваюцца за гарызонт.

Калені смяюцца з "высокіх" адносінаў мезенца і тумбачкі, з чырвонага загарэлага носа і танюткіх залатых валасоў, што ні заплесці ў касу, ні расчасаць, ні сабраць у хвост.

На калені глядзелі зацікаўленыя хлопцы, праваe калена аблізваў сабака, левае калена стаяла спераду на фотаздымку. Вялікі абцас не змог захаваць раўнавагу, яго сусед па другую нагу збег кудысьці, два круглыя сонцы стукнуліся ілбамі і разам пацалавалі асфальт...

Пачаўся смутак. Дзве сонечныя сястры з разбітымі, але ўсё ж мілымі тварамі былі заціснутыя ў джынсавую камеру, на іх рот наляпілі маску-пластыр, каб не крычалі ад крыўды. "Дагуляліся" — думалі яны.

Праз джынсавыя муры не было відаць летняга наваколля. Зніклі закаханыя мужчыны, страціліся торбы, заплечнікі і котка. "Шчасця няма" — пакутавалі яны.


Хоць бы дзірка! Хоць бы спадніца была карацейшая! Дык не.

Навакольны сусвет не пазнае мяне, загорнутую ў шматлікія пласты адзення. Зрок шукае два сонцы, якія больш не зззяюць. Гарачая рука спыняецца раней, чым дасягне калена. Котка і торба — побач з сіня-шэрай турмой, дзе сядзяць абвінаваныя ў нічым два круглыя гладкія сонцы.

Пройдзе час, канвой здыме маскі, і сонечныя сёстры зноўку адчуюць свабоду.

Ідал

З «Інтымнай хронікі часоў міжвер'я»



Галіна БАГДАНАВА



Фота www.histmuseum.com

Разамлелы за дзень спёкі колкі хвойнічак пацягнуўся, няспешна, лянотна крануў, паказытаў сваім няроўным, іглістым ценем раку і, стомлены, сцішыўся ў чаканні прахалоды. Блiскалі срэбнымі маністамі вербы, з палёгкаю ўздыхаў, пазяхаў стаптаны рупным сенакосам поплаў. Яшчэ пару гадзін, і вось ужо дачакаліся — наплывае, рассыпаецца росным бісерам туман. Мякчэе, разнявольваецца мурог, нават глеба. Лёгкі вэлюм туману спавівае, ахінае кожную травінку, кожную красачку, пад яго мяккім дотыкам аджывае павялае ад гарачыні пер'е аеру, сцішваецца, уплятаючы ў даўгакосыя водарасці жаўтароцікі-гарлачыкі і жамчужныя лілеі, рака. Вы хоць калі заспелі, заўважылі тое імгненне, калі ападае раса, калі пачынаецца вечар?..

Усё наўкола запавольвае дыханне, млее ў чаканні прахалоды, у чаканні адпачынку. Толькі рачныя хвалі, хоць ніхто ж іх, нават вецер, не прыспешвае, не даюць сабе перадыху. І ажно голаў вядзе ад рухомае гэтае плыні. Сонца ўсё яшчэ цягнецца, мякка кранае, цалуе зямлю. Ніяк не нацешацца адно адным. Трава, узбярэжныя вербы яшчэ трымцяць, сцінаюцца пад дотыкам сонечных промняў. І рака нястомна ўплятае мігатлівыя бліскаўкі ў свой жывы плывучы ўзор, які імкліва, дрыготкімі хвалямі перацякае на лілеі, гарлачыкі, густы аер, на адзін, другі бераг, на срэбныя вербы, залатыя, звонкія хвоі, вышэй, вышэй, — да самага неба… А спавітыя сонечным, жывым люстэркавым мігценнем рачных блікаў галінкі ўжо трымцяць у чаканні новага дотыку. Яны трымцяць у чаканні цяпла і вільгаці. Усё наўкола яшчэ такое жывое, рухомае. Толькі вось гара. Змрочная, быццам засланая аксамітам, зялёная гара на тым беразе, за поплавам, як стаяла, так і стаіць нерухома. Яна, суровая і ўнурыстая, быццам адасобілася ад усяго свету. Да яе не дацякаюць ні вечаровыя цені, ні сонечныя блікі, ні рачныя люстраванні. Яна цешыцца і ніяк не можа нацешыцца сваёй уласнай самасцю. Прыгледзьцеся, гэта ж ад яе, ад зялёнай гары, наплывае, ахутвае ўсё наўкола вечаровы туман. Быццам расчыніў нехта там куфар і вымае, сцеле ўсцяж, да самага далягляду, густы вэлюм… Яна, тая гара, заварожвала. Але Любава, што хацела крыху паплаваць, змыць дзённы пыл і стому, перавяла позірк на сонца. Прымружылася. Нябеснае святло сцялася, выцягнулася крыжам. Расплюшчы вочы, і вось яно зноў разнявалілася, расцяклося, жывымі блікамі заткала ўсё наваколле. Усё, апроч той, парослай хвойнікам, маладым ельнікам непадступнай тумановай гары, ад якой наплывае вечаровы туман, што расою ападае на травы і кветкі. Дзіўна, гэтая гара быццам супрацьстаіць Сонцу…

— Я прашу цябе, Сонца, я малю, пакуль не ахінуў, не сцёр цябе з неба туман, выслухай мяне, памажы. Я сцякаю пяшчотаю, я больш не магу жыць, я прагну любові. Я хачу, дай сілы мне, у рэшце рэшт, пераадолець гэтую немую ліхаманку, гэтае неўтаймоўнае трымценне душы і цела. Я хачу быць каханаю, я кахаю і хачу быць каханаю. Сёння, Сонца! Прашу цябе, наталі маю смагу, наталі!

Любчык бачыў, чуў… Ён выйшаў з-за дрэваў, калі яна толькі пачала распранацца, і стаіўся, замёр. Вочы сталі бы шкляныя. Не заплюшчыць. Не адвесці. Усярэдзіне ўсё запульсавала, затрымцела, сцялася. Мляўкі туман. Не варухнуцца. Нарэшце ён пракаўтнуў, правёў рукою па пульсуючых, напружаных, гарачых скронях, паспрабаваў прыгладзіць вусы, заблытаўся ў сваёй густой, кучаравай чупрыне. Любава, гэта яна, Любава, плыве, адплывае на той бераг. Павярнулася б хоць на імгненне, патанула ў бяздонні закаханых вачэй…

Ён ішоў на рэчку, каб змыць пот, ды што там, хоць бы апрытомнець пасля гарачага, пыльнага сенакосу. Пасля смерці бацькі сенакос, як і ўся гаспадарка, толькі на ім, старэйшым. Ён ішоў ні пра што не думаючы. А тут, на табе, яна, Любава! Ва ўсёй сваёй непераадольнай чароўнай вабнасці. Сёння ён яе, здаецца, ужо бачыў краем вока, калі яна прыносіла свайму бацьку абед на поплаў. Аддала спарышы і не прысела нават, пайшла, бы растала ў лесе. Яна заўжды так: і з'яўляецца, і сыходзіць ціха-ціхенька, незаўважна, бы сплывае, адлятае, як аблачынка… Была малая, дурэлі, разам у пяску корпаліся, за косы ён яе цягаў, а яна яго за чупрыну, баранчыкам яшчэ дражніла. Схаваецца за плот і язык паказвае: «Любчык- баранчык! Бэ-э!». Хлопцы ўвесь час яго падбівалі: «Ды дай ты ёй хоць раз як след, каб адчапілася!». А ён, хоць яму і крыўдна было за тое яе «бэ-э-э!», толькі рукою махаў: ну дражніцца, дык дражніцца. Што яму да таго. Ён ведаў, што ў ягады ды грыбы з Любавай цікавей, чым з кім, было хадзіць. Яна ўсе зёлкі, усе кветкі ведала, галасы птушыныя пераймала. Дзе які грыб, дзе якая ягада, бы на нюх, адчувала. Яны раней за ўсіх падымаліся і ўсе месцы грыбныя абыходзілі. Здаралася, што яшчэ да абеду па два кашы баравікоў рэзалі. Ажно разгубліваліся: а як жа дацягнуць кашы тыя? Налаўчыліся. Спачатку адзін кош удваіх падцягнуць, потым — другі, за ім — трэці, чацвёрты, так, па чарзе перастаўляючы, і да вёскі дабіраліся. І ўсё ім у радасць, весела неяк, проста было. А цяпер, як на дзеўку яна брацца стала, што з ім робіцца, сам не ведае… Не тое што падысці, пагаварыць, зірнуць не асмельваецца. Змянілася яна, пахарашэла. Толькі ў яе ўсё тыя ж агеньчыкі гарэзныя, зялёныя скачуць. Хмельна яму ад тых агеньчыкаў і ад усмешкі яе таксама хмельна робіцца…

Не зводзячы з яе вачэй — яна плыла, і лёгкія, лебядзіныя ўсплёскі яе гнуткіх рук-крылаў быццам клікалі яго за сабою, Любчык скінуў, паклаў сваё адзенне побач з Любавіным, пацалаваў свой нацельны крыжык і вырваўся з павуціння вечаровых ценяў-блікаў, узляцеў, плёхнуўся ў ваду. Аддаўся цёплым, лагодным хвалям.

Любава нічога не пачула. Яна ўжо амаль даплыла, але выходзіць не спяшалася, адганяючы слізкія водарасці, паспрабавала выбраць сабе лілеі. Тут яны былі найбуйнейшыя. А вось гэтыя гарлачыкі, яшчэ нядаўна яркія, ужо адцвілі. Любчык дагнаў яе, калі яна яшчэ была ў вадзе, зачапіўся за сцябло, даў нырца і, не зважаючы на Любавін віск, на руках вынес яе на бераг.

Любава крутнула галавою, і закручаная каронай каса вільготнаю змейкай каўзанулася ледзь не да зямлі. Любчык пахіснуўся, але не, утрымаўся, асцярожна дапамог стаць Любаве на траву, ужо амаль сухую. Сам сеў побач.

Дзіўна, Любава, здаецца, толькі цяпер заўважыла, што яна зусім без нічога, голая, а побач Любчык. Яна заружавела, паспрабавала лілеямі захінуцца. Толькі ценем, хіба сваім ценем кветкі ахоўвалі яе юнае цела. Адзенне на тым беразе. Дык хай бы там, на тым беразе, разам з ім засталіся і сорам, і гэтая іхняя заўсёдная, непераадольная насцярожанасць, як бы нават нацятасць… Вось жа яшчэ нічога адно аднаму не сказалі, толькі ўсміхнуліся, а яны ўжо разам, нарэшце разам. Вечнасцю падалося гэтае адно-адзінае імгненне. Вуснамі кранула свае жамчужныя лілеі, хацела пакласці іх на траву… Ды засмяялася няроўна, звонка. Свайго смеху ён, Любчык, не чуў, вушы заклала. Кроў пульсавала ў скронях і закладала вушы. Толькі па ўсім целе нейкая дзікунская сутарга, і глуха стукнула сэрца. Цяпер гаварылі, спрачаліся, сплеценыя ў жывую рухомую плынь целы. Вада сцякала. Цяпло вільгаці. І трава, кветкі. Ды што там, нават поплаў, бераг, рэчка, уся зямля ўгінаецца, плыве пад лёгкім цяжарам іхняй бяздоннасці. Яны ўздымаюцца да нябёсаў і зноў падаюць у бездань. Арэлі, чароўныя, зямныя арэлі вечнасці. Яшчэ, яшчэ… Уплеценыя ў мурог краскі-бліскаўкі шэпчуць нешта, казычуць у самае вуха. Аер хмеліць, ён такі вільготны, мяккі і хмеліць да самазабыцця. Вось зараз, чуеце, зараз цвыркуны-конікі заціньканоць, як людзі… Не, гэта яны заразператворацца ў цвыркуноў, у казюрак і заблытаюцца, растануць у гэтым мурагу, у гэтай пяшчотнай, мяккай, шаўковай траве… Любава адвярнулася, пацягнулася і ўжо аднымі вуснамі прыпала да рассыпаных па траве росных, усё яшчэ поўных вільгаці ганарлівак-лілеяў. Не, яна ўсё ж вып'е, сцалуе гэтую расу. Так піць хочацца… Любчык пацягнуўся ўслед за ёю і зноў натрапіў на вусны — пругкія, вільготныя, нястомныя…

— У мяне сёння будзе не вянок, а карона. Я спляту яе з гэтых лілеяў.

Яе бессаромныя, яшчэ вільготныя зеленаватыя вочы поўніліся пяшчотай і шчасцем. Так, яна была шчаслівая. Любчык заплюшчыўся, адкінуўся на траву. Мяккая дрымота расцякалася па стамлёнай, знясіленай зямлі…

— І яшчэ мы сёння з табою сходзім на Зялёную гару. Адна я баюся, а з табою, з табою мне нішто не страшна. З табою мне цяпер нішто не страшна, — сказала, шапнула Любава.

А ён, ён спужаўся, перажагнаўся:

— На… Перунову гару? Ды ты што? Кажуць, яна заклятая.

А Любава дапляла сваю карону і ўстала:

— А мой бацька ходзіць туды. І бабуля хадзіла. Раней усе з нашае вёскі туды хадзілі.

— Пачакай, — збянтэжыўся Любчык. — Давай хоць не сёння… Сёння ж якраз Купалле. Кажуць, што злыдні ўсе сёння вылазяць… І Святар у царкве казаў, што нячыста сёння…

— Нічога, — усміхнулася Любава і рашуча пайшла да Перуновай гары. — Вернемся — разам з усімі ў рэчцы адмыемся.

Перасільваючы сябе, з неахвотаю, Любчык крануўся ўслед. Сонца ўжо схавалася за Перуновай гарой, тут, на поплаве, не відаць было ўжо яго. Але яны падымаліся вышэй і вышэй, і там, унізе, усё патанала ў ружовым тумане. Ён хацеў не адстаць, а Любава вавёркаю слізгала між дрэваў, між хвоек, не пераводзячы дых. Колкая іглiца ападала на плечы, уядалася ў ногі. А шышкі, колькі тут было шышак! А яна ўсё ўверх і вышэй, вышэй, туды, дзе яшчэ відаць сонца. На хаду адламала папараці сабе і яму — адганяць камарэчу, і зноў знікла, трэба зноў яе даганяць. Толькі выйшлі з ляснога сырога паўзмроку, туды, дзе яшчэ цяплела сонца, як нечакана Любава зноў штурханула за елку. На асветленым апошнім, не сляпучым, мякка-ружовым, нават не святлом ужо, а толькі ягонымі хвалямі, плынню ўзлеску, там, куды яны толькі што, запыханыя, ледзь не выбеглі, хтосьці быў.

І гэты хтосьці — мужчына, якога Любчык яшчэ не разгледзеў, яшчэ не пазнаў, маліўся, гучна маліўся, укленчыўшы, самому Перуну.

— Пярун усёмагутны, бог наш святы! Ты апякуеш мяне з самага маленства. Маці мая табе біла паклоны, і я табе да смерці маліцца буду. Памажы мне…

Любава гэты мяккі, глухі, хрыплаваты голас пазнала б з усіх. Любчык прыгледзеўся. Моцная, крыху ссутуленая спіна, сівыя валасы, чорная барада.

— Гэта мой бацька, — шапнула Любава і збянтэжылася.

Падумаць страшна, што б было, каб яны вось зараз, так, голыя, са смехам, як беглі, так і выскачылі б перад ім.

— Каваль? — усё яшчэ не верачы, перапытаў Любчык.

І Любава адчула, што сорамна ёй не столькі за сябе і Любчыка, голых, колькі за свайго бацьку. Хоць і апрануты ён, у сарочцы ж, у штанах і з… крыжыкам, а… Здаецца, усё ўсярэдзіне сціскаецца, бо падгледзелі, пачулі яны нешта вельмі саромнае, што няможна было, не трэба было ім чуць.

Бацька згінаўся да самае зямлі, потым уздымаўся і гаварыў, гаварыў:

— Пярун усёмагутны, уладар наш вечны, дапамажы мне, дапамажы мне заўтра выкаваць тое, што замовіў мне сам наш Князь… Кайданы для Волата, якога ён паланіў. Маці казала мне, наказвала, што ніколі і ні для каго не павінен я каваць зброю. Але ж кайданы — не зброя. Я пастаўлю на іх твой, Перуноў, знак, тваю маланку пастаўлю. А ты ўжо памажы выкаваць такія кайданы, каб ніхто, нават Волат, не змог іх разарваць. Сёння мы ўсе будзем святкаваць Купалу. Будзем славіць Лёлю і цябе, усёмагутны. Ты наш галоўны абаронца. На вогнішчах спалім нячыстае, усё брыдкае. І будзем спяваць, будзем гуляць і любіцца. І я, чуеш, і я ахвярую табе сёння любоў, насалоду сваю. Я ахвярую табе ўсяго сябе. Толькі памажы, чуеш, памажы!

Забыццё. Утрапенне… Бацька схіліўся і застыў. За ўсхліпамі было не разабраць слоў. Любчык перахрысціўся. Любава, не падымаючы на яго вачэй, толькі закусіла губу.

Нарэшце Каваль прыўзняўся, устаў з каленяў і, не азіраючыся, пайшоў, пакрочыў з гары.

Любава з Любчыкам дачакаліся, пакуль ён схаваўся ў ельніку, вызірнулі, агледзеліся, падышлі бліжэй. З-за елак ім было не відаць, а цяпер… Вось ён, той, каму Каваль біў паклоны. Пярун, былы іхні ідал. Але ж гэты свежы, жоўценькі, быццам яго зусім нядаўна выразалі. Смалою пахне. Жывіцаю. Вочыцвікі, чорныя, стылыя, яшчэ не заржавелі. Ружовы, сонечны вечаровы туман утвараў над ім лёгкі прамяністы німб.

— Чуў я, — усё яшчэ шэптам загаварыў Любчык, — што тут, на гэтай гары, і даўней быў Пярун. Але ж яго, здаецца, разам з іншымі пусцілі па рацэ. А гэты як новенькі.

У ружовым з сонечным водсветам тумане дрэва набывала адценне жывой чалавечай плоці. Хто ж гэта наноў выразаў Перуна? Ім з Любчыкам ён быў усяго да пояса. Любава міжволі правяла даланёй па божай галоўцы. І на дотык адчула: уверсе драўляныя валасы як бы раздвойваюцца, а на макаўцы, на цемечку — жывая ямінка з дзірачкай... Ззаду валасы акуратна закругляліся, загіналіся і крыху адставалі ад шыі, якой увогуле і не было, яна злівалася з Перуновымі плячыма, усім ягоным роўным, акруглым целам. Які ён гладзенькі, цёплы, поўны дзівоснае зямное сілы...

— Глядзі, Любчык, — сказала Любава. — Глядзі, ён нічога табе не нагадвае?

Яна зірнула на яго так, што Любчык засырванеўся.

— Разумееш, пра што я кажу? — Любава апусціла вочы.

— Не грашы... — шэптам вымавіў Любчык.

Ну як яна можа, як не баіцца вось так казаць пра хай сабе і адвергнутага ўжо, але ж бога! Але цяпер, цяпер і ён, як і Любава, пэўна ж, не зможа пазбыцца гэтага прывіду...

Ідал сапраўды нагадваў жывую мужчынскую плоць...

Назад яны не беглі, а ішлі. І Любчык, сам сябе ратуючы, бо ўсё глыбей і глыбей засмоктвала яго багна ўжо не лёгкага, а нейкага важкага, гнятлівага пачуцця, не падымаючы вачэй, раптам загаварыў пра тое, пра што не варта было, пра што і не наважваўся ніколі раней:

— А ты, Любава, пэўна, і праўда, як усе нашыя хлопцы кажуць, крыху чараўніца. Яны кажуць, што ты не такая, як усе, што цябе баяцца трэба. А я вось... Ты сёння звабіла мяне. Зачаравала... І бабка ж твая Траўніца-чараўніца. І бацька вось да Перуна ходзіць, і ты...

— Але ж раней, зусім жа нядаўна і твае бацькі, і дзяды нашыя, усе людзі раней Перуну маліліся. А бабуля мая, яна ж усіх, цябе таксама лячыла. Памятаеш, як гадзюка цябе ўджаліла? Ты ж да яе пайшоў. Кажаш, баяцца мяне ўсе... Кажаш, зачаравала. Мулка табе са мною? — І яна, як крылом, узмахнула рукою. Страпянуліся, зазвінелі бранзалеты. — Не трымаю я цябе. Бяжы, уцякай. Усім, усім раскажы, якая я. Каб яшчэ болей баяліся. Што ж стаіш? Уцякай!

— Не, — Любчык ухапіў яе за руку. — Даруй. Я сам не ведаю, што кажу. Лепш пайшлі хутчэй, пайшлі адсюль. Сонца садзіцца. Туман. Камары заядуць.

— Села. Закацілася маё сонца, — неяк бязвольна, зусім ціха вымавіла Любава...

Раптам ім стала зноба, да дрыжыкаў. Адсюль, з гары, было відаць, што за рэчкаю, на тым беразе, ужо запалілі вогнішчы. Купалле...

Яны пабеглі, каб хоць крыху сагрэцца. Па колкай іглiцы, скрозь ельнік, скрозь хвойнік, туды, да поплаву, да рэчкі. Удзень вада была жаданаю прахалодай, а цяпер сагрэла, як цёплы, парны сырадой. Вогненныя іскрынкі калыхаліся ў небе побач з зоркамі. Месяц на імгненне вылузнуўся, выслізнуў з туману, правеў па вадзе пасак. Бяскроўны, бледны, не тое, што жывыя, гаманкія вогнішчы...


Фота www.yesbelarus.com

Плылі, плылі, а потым Любава зняла, пусціла ў змрок, у туман па месячным следзе свой вянок, сваю лілейную карону. І перавярнулася, легла на спіну, аддалася вадзе. Любчык таксама перастаў грэбці. Туман апаў. І там, у вышыні побач з месяцам, зайгралі буйныя, ясныя зоркі. Яны былі так блізка! Здавалася, працягні руку, і яны твае. Ніякага кошыка не хопіць, каб пазбіраць іх усе. Ды і ці збіраў іх калі хто. Яны самі выбіраюць, каму паказацца, перад кім упасці, каму прынесці ўдачу, а каму бяду, смерць... І зоркі, як людзі, таксама любяць купацца ў гэтай цёплай, як сырадой, вадзе. Гайдаюцца на хвалях, самі сабою любуюцца... Кветкі, гарлачыкі і нават лілеі, як толькі не стала сонца, адразу заплюшчыліся, сцялі свае пялёсткі... А зоркі вось плывуць, цешацца... Ноч — гэта іхняя пара. І месяц плавае між іх, усміхаецца.

Любчык вобмацкам адшукаў Любавіну руку. Што б там ні было, а цяпер яны разам. Сёння яны ўпершыню спазналі, што такое быць разам, яны спазналі бязважкасць, глыбіню, яны спазналі бяздонне... Ля берага іх ніхто не заўважыў. Там было шмат такіх, як яны, закаханых.

Хлопцы, дзяўчаты, якіх без адзення не пазнаць, скакалі, пырскалі адно на аднаго вадою. Вянкі саслізгвалі з дзявочых галовак, плылі, плылі ўслед за тымі, якія дзяўчаты пускалі наўмысна, каб пагадаць, паваражыць, хто ж з іх першаю выйдзе замуж. Вяночкі адплывалі. Хвалі, мяккая плынь неслі іх уперад, туды, дзе растала ў змроку і Любавіна лілейная карона. Тут, пры беразе, зоркі не плылі, не спачывалі, а танчылі, скакалі, карагодзілі разам з усімі. І зноў падскоквалі, ці выпадкова, ці наўмысна наколваліся на вострыя месячны ражок і плакалі, стагналі ад насалоды...

Любава з Любчыкам, крыху прыстояўшы, разам, трымаючыся за рукі, выйшлі з вады. Ніхто не звяртаў на іх увагі. Адзенне ляжала там, дзе паклалі. Яны моўчкі, перамагаючы дрыжыкі, ажно зубы пачыналі стукаць, апрануліся і пайшлі грэцца да вогнішча. Тут, на беразе, было халадней, чым у вадзе... Працягнулі рукі да агню і толькі тады заўважылі, што ля вогнішча побач з імі нікога няма. Можна было падумаць, што нехта спецыяльна расклаў гэты агонь для іх дваіх. Над вогнішчам на жэрдцы было замацавана старое кола — знак сонца. Кола не вытрымала, упала, і вогненныя языкі пераўтварылі яго ў сапраўднае сонца...

Сёння, на Купалле, і сонца, і зямля ў самай сіле, у самым росквіце... Не дарма ж менавіта ў гэтую пару усе траўніцы, і Любавіна бабуля таксама, назапашваюць зёлкі. Заўтра, і паслязаўтра, і потым, амаль да самых Калядаў, дзень пачне меншаць, а ноч будзе адкусваць, глытаць, з'ядаць святло.

Зёлкі сёння ў сіле, але ж і нячысцікі на Купалле баль правяць. Што хочаш могуць утварыць. Як на арэлях, як на шалях сёння дабро вялікае і шкода немалая. Лепш, калі шалі ўраўнаважацца. Калі ўсё як ёсць будзе. Бо пасля вялікай радасці чакай бяды. Але ж і бяда — шлях да вялікае радасці...

— Калі я быў малы, — раптам успомніў Любчык, — не спалася мне нешта на Купалле. У акно вылез аднойчы — і на рэчку. А там хлопцы, вунь з таго ўзгорка якраз вогненныя колы пускалі. Колаў многа, і ўсе коцяцца, адно за адным, адно за адным. А я малы ж быў. Спужаўся, падумаў, што гэта сонца з неба ўпала і рассыпалася. Прыбег дамоў, маму збудзіў, плачу: сонца няма, дзень больш ніколі не вернецца. Ведаеш, што мне мама тады сказала? «Ты не бойся, зараз хлопцы ўсе маленькія сонейкі збяруць і зноў у адно вялікае іх злепяць, а раніцай на дах залезуць і да неба цвікамі прыб'юць». Я заснуў тады. А зранку ўсё хадзіў і прыглядаўся, у каго рукі апечаныя. Разумееш жа, што сонца гарачае і той, хто яго да неба прыбіваў, апячыся мог.

Любава слухала і не асабліва ўдумвалася ў тое, што гаварыў Любчык. Ёй было соладка слухаць ягоны глыбокі, сцішаны голас, проста слухаць і глядзець, як імкліва ўспыхваюць у ягоных вачах вогненныя блікі...

— Кажуць, што калі сёння знойдзеш у лесе кветку папараці, — яшчэ больш сцішыўшы голас, прамовіў Любчык, — яна якраз да поўначы мусіць раскрыцца, дык вось, калі сёння ў лесе знойдзеш тую кветку і сарвеш яе, дык усіх звяроў, птушак разумець зможаш. І жыць будзеш вечна.

— А нашто жыць вечна? — задумліва спытала Любава. — Сумна. Усе паўміраюць, а ты жыві. Вось сам уяві, каб я састарэла, памерла, а ты жыць застаўся. Ты б без мяне якую іншую пакахаў, любіўся б з ёю, потым жаніўся. Дзеці б у вас нарадзіліся. Без мяне.

— Ну жыць, як жыць, а звяроў ці там птушак я б хацеў разумець. Пра што яны там між сабою гамоняць. Уяўляеш, ідзеш сабе па лесе, а пугач табе з дрэва: «Дзень добры!».

— «Вечар добры!», а не «дзень добры!», — папраўіла Любава, — удзень жа пугач спіць.

— А потым: «Як здароўе?» — пытаецца. А я яму: «Дзякуй, добра. А ці не бачыш ты, даражэнькі, дзе паблізу грыбоў ці там ягад?»

— Ну насмяшыў! Ты ўночы па грыбы пойдзеш? А мой бацька па бабулінай вучобе без усякай папараці і звяроў, і птушак, і нават дрэвы разумець можа. Яны ўсе, і нават кветкі, падказваюць яму і калі дождж будзе, і калі сухмень. Ён і да завеі ўзімку заўсёды загадзя рыхтуецца. Спытаюся ў яго: «А хто табе сказаў, што завея будзе?», а ён: «Жучка набрахала»...

Яны загаварыліся і не пачулі, не заўважылі, што ў іх за спінаю стаіліся, стаяць і слухаць іх два незнаёмыя хлопцы. Адзін кучаравы, з тоўстымі натапыранымі вуснамі і нізкім пукатым ілбом. А другі — рыжавусы, вастраносы, вяртлявы. Баран і Ліс. Хутка ў вёсцы ўсе дазнаюцца, што іх так завуць. І ніхто нават не здагадаецца, што яшчэ нядаўна яны былі звярамі, жывёламі, што яшчэ нядаўна яны не ўмелі не толькі гаварыць, але і хадзіць на задніх лапах...

Дзяўчаты падбеглі, як былі, голыя, пацягнулі Любаву дараблядь саламяную ляльку, якую хацелі пад раніцу спаліць ці пусціць па вадзе. А Любчык разам з хлопцамі пайшоў скакаць цераз вогнішча. Яны наўмысна выбралі самае вялікае, каб выпрабаваць свае сілы, каб ачысціцца. Нехта падштурхнуў да агню і Барана з Лісам, але тыя толькі незадаволена зафыркалі і адскочылі ўбок, схаваліся, расталі ў гушчары.

Пад раніцу, калі пачынала ўжо віднець, калі наскакаліся ўдосталь і па рацэ ўслед за дзявочымі вянкамі паплыла саламяная лялька, калі пачыналі ўжо разыходзіцца, Любава з Любчыкам вярнуліся да свайго вогнішча — цяпер ужо да маўклівай шэрай гурбачкі попелу. Можа, агонь і праўда перадаў сваю моц сонцу? Ужо ружавее. Зноба. Трывожна і зноба. І целу, і душы трывожна і зноба. Пагрэцца б. Але ж сонца яшчэ толькі падымаецца з-за лесу. А зноў збіраць ламачча, раскладаць агонь няма ні ахвоты, ні сілы. Проста тут лёг бы ды заснуў, але дамоў трэба. За касу — і на поплаў. Касі каса — пакуль раса, раса далоў — касец дамоў.

І раптам... Любава з Любчыкам ад нечаканасці ажно здрыгануліся. Раптам з ельніку, з кустоў з рогатам, з усхліпамі выкаціўся аднарукі бажавільны Саўка. Як заўсёды, у кажуху, аблавушцы. Яны злякнуліся, адскочылі. А ён ціха-ціхенька падышоў, прысеў ля былога вогнішча і, прыклаўшы да вуснаў палец, маўляў, «ціха», пачаў... Ды так ясна, без усхліпаў, па-людску:

— А я, ведайце, знайшоў яе, папараць-кветку. Летась. Я не басанож, я ў лапціках быў... Яна такая маленькая, ружовенькая. І красуе, цвіце ўсяго адну хвіліначку... Я і не прыкмеціў яе, і не рваў. Яна сама да мяне прыхінулася. Іду па лесе, цёмна, хоць вока выкалі. І раптам чую: сава на дрэве вухкае, а я... я разумею, пра што яна вухкае! «Ой, надакучыла ж мне на гольцы сядзець! Палётаю трохі, а то крылы замлелі». А далей — болей... Мроіцца мне пачало... Рознае... Мроіцца, што праз гады, тут, на гэтым самым месцы, дамы вырастуць. Ды такія высокія, вышэй за гэтыя хвоі. І з каменю, усе дамы не з дрэва, а з каменю... А людзей у тых дамах... як мурашак. І па небе людзі лётаюць, і пад зямлёю людзі поўзаюць... Ажно млосна мне стала ад тых відаў. Сеў я пад яліну, вось пад гэтую самую яліну сеў, думаю, дай пераабуюся. Як бы муляе нешта. Ну і вытрусіў тую кветачку. Кволенькую, ружовенькую. Яшчэ падумаў, во макрыца нейкая трапіла і муляе. А як толькі вытрусіў я тую макрыцу, папараць-кветку значыць, то і мроіва, віды тыя зніклі. І звяроў-птушак разумець я перастаў. Сава вярнулася, вухкае ў мяне над галавою, як бы просіць чаго, а я ўжо яе не разумею. Тут толькі дайшло да мяне, што не макрыцу, не травінку, папараць-кветку вытрусіў! Кінуўся шукаць. А яна ўжо знікла. Віднець пачало, ну яна і знікла.

Сеў Саўка да астылага вогнішча, уздыхнуў. Важка. Горка. Попел, цёплы яшчэ, у рукі ўзяў, перасыпае і ўсё ўздыхае, уздыхае. А потым як заплача. З адчаем.

— Гэта Зюзя. Зюзя! Усё ён. І кветачку тую ён у мяне ўкраў. І агонь ён ваш агонь патушыў. Як убярэцца ў сілу, то і сонца затушыць. Вось пабачыце, убярэцца ў сілу — сонца затушыць. Сёння любяцца ўсе. Толькі мяне, толькі Саўку беднага ніхто не любіць. Ніхто!

Любава не вытрымала, падсела, пагладзіла Саўку па галаве. А Любчык толькі перахрысціўся. Дамоў, трэба было хутчэй вяртацца дамоў!

Услед за імі, сонныя, пасунуліся і Баран з Лісам. Абжывацца на новым месцы. Людзьмі. Сярод людзей.

Сонца ўстала. А Саўка ўсё сядзеў і перасыпаў мёртвы шэры попел. Са жменькі ў жменьку. Са жменькі ў жменьку. Развейваў па свеце горкае сваё шчасце...

Мост у неба



Катарына ЛАЎМЕЛЬ

Катарына Лаўмель — мастацкі псеўданім Катажыны Назарук — польскай паэтэсы, культурнай аніматаркі і філолага. Аўтарка зборнікаў вершаў: «Жонка Бедуіна» (2011), «Шэпт і космас» (2014), «Антураж» (2019). Удзельніца шматлікіх сустрэч творцаў, літаратурных польскіх і міжнародных фэстаў. Сяброўка Гданьскага клуба паэтаў і літаратурнай групы «Na Krechę». Жыве ў Партугаліі.

На скалах Алгарве

мы дыхаем — глыбока
дзікасць ветру гэта крылы
і мары ўжо не проста хваля
я дазваляю акіяну і табе несці сябе
без карты без компаса
і ніякага кампрамісу буя

мы больш не лічым
ліхтарыкаў у небе —
нават для загубленых чаек
ноч не чужая
мы плывем з трыумфам
развітага ветразя
запіхнутыя ў ранішні туман

за скаламі думкі круцяць віры
зашмат вуглякіслага газу —
экалагі паўтораць за намі
(без літасці)
што гэты агонь як пажар
шалёна іскрыцца
ў нашых сэрцах

І нашто… *гэтыя ад'езды*
для пошукаў прасторы
і лабірынты першапачатковай
велічыні космасу
цішыня, якая — калі нараджаецца —
гудзе
дэцыбелы бярэ сабе на службу

і пустыя хвіліны
змаўляюцца ў маёй галаве
супраць палёгкам
і бестурботнасцям
дэ-факта — ты задумчывы
супраць сябе
верыш што яны не твае
а проста з тэлебачання
а хапіла б толькі
павярнуць назад
зазірнуць гэтым страхапудам
у зрэнкі
памятаць што кожны канец
гэта пакамечаны пачатак

ты жывеш у пачуцці
што Бермудскі трохкутнік
выпусціў са жмені
вераб'я і лебедзя — тваіх херувімаў

Партугальскія мульгерэс*

маюць асалоду
ад сонца ў кавярнях Алгарве
і ў варшаўскіх Лазенках сівавалосая
корміць галубоў
спакойная і далікатная
для рытуальных птушыных раніц
прабегла паўмарафон
больш не адчувае выбуху гневу
не дагледжвае шнараў
з кожным годам усё цяжэй
прыліпае да зямлі
усмешка з якой цалуе матылёў
павінна быць часткай календара —
не прытвараецца —
прыгажэе з кожнай маршчынай
памятае што найцяжэй дараваць

* Па-партугальску — жанчыны.

На выбарчым плакаце

пустая размова лопае
як мыльная бурбалка
хай яе напоўняць словы —
апількі
маляўнічая мякаць ад Фабрыкі Сноў
перапынак пакаяння скончыўся
і разлічванне на лягчэйшыя дні
няхай словы не гучаць нема
туга штурхае верш да немаўчання
бо добрае слова перад сном
спакушае
як плюшавая падушка

у людзей з плакатаў
ад пастаянных усмешак
апускаюцца шчокі
павекі
вусны

Хвіліны-сутнасці

у нашым Асгардзе пакой
пахне зялёнай гарбатай і табой
думкі паддаюцца аўры
моманту быцця
эфемерда некалькі гадзін
зачаравана ў кадрах фатаграфій

кожны раз калі ты
як дождж і свежасць акіяна
распускаеш мае эмоцыі
дасягаючы да ядра
стукаеш да колішняй Афрадыты
каб пазычыць солі жарсці
альбо зачароўваеш яе
ў боль чарговай тугі

расчэсваю валасы
упарадкоўваю свае пачуцці
краплю цела
задыхаюча-павабным
водарам Белай Жамчужыны

ты здымаеш яго
вельмі хутка як стрынгі
часам з грубым рэверсам усмешкі
я паглынаю цябе
і мігценне моманту
найбольш прагная
вінных вечароў і раніц
кранаю вуснамі спіну
і сцёгны як Гея камякі зямлі
разгортваю чарговыя пласты
ў пошуках скарбаў
цаляючы ў тое
што за небасхілам

Фрыг з усмешкай тчэ хмары

Жонка Бедуіна

Згорбленая
Сумная
Сухая
Жонка Бедуіна
без слова падае ваду
для абмыцця ног

Для яе
апошні кавалачак бараніны
глыток вады з бруднай біклагі
Без права адмовіцца
без волі да жыцця
без волі на адмаўленне
што яна шчаслівая

Колькі разоў
ты бываеш жонкай
і колькі разоў
ты жонка Бедуіна?

Акушэрка

Яе скрываўленыя рукі
прымаюць жыццё
ад прыязнай
дзевяць месяцаў маткі
яна першая кранае дзіця вачыма
пераразае пупавіну залежнасці
і захоплівае яго
ў свет двухногіх істот
якіх называюць людзьмі
вяртае да маці
прагнай пачуццяў
плён выспеўшы ў ёй
на працягу некалькіх месяцаў
малюсенькі вузельчык
загорнуты ў тэтру
Кахання
альбо праблем
па крыку дзіцяці
распазнае яго алфавіт
эмоцый
вопытная акушэрка
шпітальная сувязная з прыродай
штодзённа сілкуецца ўсмешкай
з радасцю маладых мам



Фота www.ruchron.com

Мост у неба

Ёсць месцы
да якіх ты ідзеш толькі адзін
без запісу аб нараджэнні
без страхавой кніжкі
крэдытных картаў
пасярэдніцтва святара.
У закавулках сумлення
улік поспехаў і страт.
І тады я сартую эмоцыі.
Я буду каталагізаваць
ворагаў маіх дзяцей
даючы ім пароль: небяспечныя.
Падмацуюся апошняй
стравай думак
што не растаптала па дарозе
ні адной божай кароўкі
нікога не заразіла
вірусам подласці.
Гэтай спражкай сашпілю
сваё зямное жыццё.

Я пачну вязаць свой мост
да нябёсаў
ніткамі забытых падзей

Дрэсіраваныя думкі

паўсталі
дрэсіраваныя на працягу
многіх гадоў
размешчаны раўнамерна
на галаве
як форма салдата
твае ратвейлеры
чорныя пажыральнікі аптымізму
што просяць на дзвюх нагах
яшчэ
не ведаючы, што такое гонар

існавалі каб кусаць раўці
нюхаць сляды радасці
і кусаць яе за лыткі
пераадольваючы
бар'еры цярпення
не ведаючы
што гэта такое —
асалода і спакой

сёння адмовіліся ад ежы
захварэлі ад перанасычанасці
нездаровым харчаваннем

сышлі
на працяглы шпацыр з сумам
і песімізмам

маліцеся…
каб зніклі бясследна

Паведамленне самому сабе

Цяпер настаў час
запісу электроннай пошты
сваім думкам.
Лаканічныя выказванні
націсне дагледжаная рука
нячулымі літарамі алфавіту.
Штучныя ўтварэнні
з трыццаці трох літар
усё больш і больш таямнічыя
і чужыя сучасным,
як Міцкевіч.

Пошта-гутарка
з адлюстраваннем,
пошта-лісты,
атрыманыя ў спешцы,
пошта-пачуцці —
аголеныя з сакрэтаў паперы,
музыкі разарваных канвертаў,
тонкасці часу на чытанне
ў цішыні,
з самім сабой у самоце.

Разбураныя жорсткасцю
пастуквання пальцамі
па клавіятуры
бесцырымоннасці.
Аголеныя ад самарэфлексіі,
хуткія непаслядоўныя тэмы,
як прыгожая дзяўчына
ў квяцістай сукенцы
і мары пра каханне,
могуць выклікаць
невылечны неўроз.

У гуку істэрыі разрываных
думак
кінутыя ў скрынку,
як выкарыстаныя інструменты
і падвергнутыя ўтылізацыі,
матэрыялізуюцца,
як попел у труне,
стануць шэрымі ў падсвядомасці.
Непатрэбнымі.

Калі адабралі ў іх душу
і сэнс існавання
ўсур'ёз.

З польскай мовы пераклала Міра ЛУКША

«Літоўскія крэчаты» на полі Куліковым: Андрэй Полацкі і Дзмітрый Бранскі

Ірына МАСЛЯНІЦЫНА, Мікола БАГАДЗЯЖ

8 верасня 1380 года, адбылася праслаўленая Кулікоўская бітва, героямі якой сталі таксама князі з Вялікага Княства Літоўскага Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы. Цяжка не пабачыць Боскай волі ў тым, што прыйшлі яны ў рускую гісторыю менавіта тады, калі іх чакалі. Смелыя, адчайныя, не ўтаймаваныя татарскім бізуном, не разбэшчаныя татарскім ярлыком. Менавіта яны былі патрэбны ў дапамогу князю Дзмітрыю Іванавічу, каб весці за сабой на татар рускія палкі.

Князь Андрэй, самы старэйшы з Альгердавых сыноў, які пры нараджэнні атрымаў язычніцкае імя Вігунт, з'явіўся на свет у 1325 годзе. Маці яго была праваслаўная князёўна Марыя Віцебская. І яна выхоўвала сына ў павазе да хрысціянства. Аднак акунуцца ў хрысцільную купель княжычу давялося толькі ў 1342 годзе. У той год разам са сваім бацькам Вігунт спыніў нашэсце крыжакоў на пскоўскія землі. Удзячныя пскавічы прапанавалі Вігунту застацца княжыць у Пскове. Альгерд дабраславіў на княжанне сына і дазволіў яму дзеля гэтага хрысціцца. Але Вігунт-Андрэй прасядзеў у Пскове нядоўга. Ён пакінуў свайго намесніка і выехаў на Беларусь дапамагаць бацьку і дзядзьку свайму Кейстуту ў іх барацьбе з крыжаносцамі. Пскавічы чакалі свайго князя доўгіх шэсць гадоў. У 1348 годзе намеснік Андрэя, Юрый Вітавіч, загінуў у бітве, і пскоўскае веча пастанавіла абвясціць Андрэю пра свой недавер.

«Табе было, князь, самому сядзець у Пскове на княжанні, а намеснікам Пскова не трымаць. Калі ж табе няўгодна сядзець у нас, у іншым месцы княжыш, то намеснікаў тваіх не хочам»…

Пасля Альгердавай смерці ў 1377 годзе Андрэй як старэйшы сын прэтэндаваў на вялікакняжскі сталец. Ваяры Вялікага Княства Літоўскага палюбілі Андрэя за яго адвагу і непахіснасць. Беларускія падданыя бачылі ў старэйшым сыне хрысталюбівай Марыі Віцебскай абаронцу праваслаўя і таму хацелі бачыць яго сваім гаспадаром. Але паводле Альгердавага тэстаменту ўлада мусіла дастацца малодшаму Андрэеваму брату, сыну другой Альгердавай жонкі Ульяны Ягайлу. Андрэй адмовіўся прысягаць новаму гасудару і пачаў самачынна называць сябе вялікім князем Літоўскім. Але сіл адстойваць свае правы зброяй у яго не было. Пазбавіўшыся па волі Ягайлы і Полацка, і іншых сваіх гарадоў, рушыў Андрэй са сваёй вернай дружынай ў Пскоў. З пакаяннем і клятвамі.

І прынялі яго пскавічы, якія ўвесь гэты час з вялікай цікавасцю назіралі за ратнымі подзвігамі Альгердавіча. І сям'я князя, якую прывёз ён з сабой у Пскоў, усім спадабалася. Набожная добрая княгіня, трое цудоўных княжат, Міхаіл, Сямён ды Іван… Адну толькі ўмову паставілі князю гараджане. Ён мусіў прасіць дазволу на пскоўскае княжанне ў вялікага князя Маскоўскага. Гэта было нялёгка. Бо ў мінулым некалькі разоў, пасланы бацькам сваім Альгердам, ваяваў Андрэй рускія гарады. Дапамагла выгнанцу знайсці паразуменне з Дзмітрыем Іванавічам сястра Алена Альгердаўна, якая была замужам за стрыечным братам вялікага князя Маскоўскага Уладзімірам Серпухоўскім. Андрэй атрымаў пскоўскае княжанне.

А ўжо ў наступным 1378 годзе ён разам з маскоўскімі рацямі прымаў удзел у бітве з татарамі на рацэ Вожы. Гэта была неглабальная, але пераможная бітва. Першая, выйграная рускімі князямі ў татар. У ёй рускае войска ўпершыню выкарыстала тактыку засадных палкоў, якую ўжо шырока прымяняла войска Вялікага Княства Літоўскага ў барацьбе з крыжаносцамі. Гэта дае права меркаваць, што стратэгію бітвы распрацаваў менавіта князь Андрэй.

Безумоўна, такая паслуга павінна была быць адзначана. І вось у 1379 годзе разам з маскоўскімі рацямі Андрэй Альгердавіч вяртаецца на землі Вялікага Княства Літоўскага і вяртае сабе Полацак. У часе пахода лёс зводзіць яго з родным братам Карыбутам-Дзмітрыем Альгердавічам, які атрымаў ад Ягайлы Трубчэўск, Старадуб і Бранск, што раней належалі Андрэю.

Варта было чакаць, што браты сыйдуцца ў смяротным паядынку. Але Дзмітрый хлебам-соллю сустрэў Андрэя. Аказваецца, ён таксама быў незадаволены панаваннем Ягайлы. І таму паспяшаўся прысягнуць як васал Дзмітрыю Маскоўскаму. Трубчэўск, Старадуб і Бранск перайшлі пад уладу Маскоўскага княства. А Дзмітрыю Альгердавічу быў дадзены ва ўдзел Пераяслаў-Залескі. І Андрэй, які пры дапамозе вялікага князя Маскоўскага зноў стаў князем полацкім і пскоўскім, не выказаў сваёй нязгоды. Тым больш, што ў Маскве ўжо ішла падрыхтоўка вялікай бойкі з татарамі…

8 верасня 1380 года на Кулікоўскім полі сышліся лепшыя сілы Русі і Залатой Арды. 100-тысячнаму войску хана Мамая супрацьстаяла 36-тысячная руская раць. Русь выставіла супраць Арды 24 цяжкаўзброенныя палкі і каля 12 тысяч конных віцязяў.



Двубой Перасвета з Чалубеем. Карціна М. Авілава

Згодна з рускай воінскай традыцыяй у цэнтры стаў вялікі полк, па баках ад яго — палкі правай і левай рукі. Андрэй Альгердавіч са сваім двухтысячным войскам палачан і пскавічоў узначаліў правы фланг. Першымі ардынцаў павінны былі сустрэць конны вартавы полк князя Дзмітрыя Друцкага і перадавы полк. За асноўнымі сіламі знаходзілася бранская конніца рэзервовага палка пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Альгердавіча. Але галоўная хітрасць, козыр Дзмітрыя Іванавіча быў прыхаваны за левым флангам вялікай раці, у Зялёнай Дуброве, паміж рачулкай Смолкай і Донам. Тут знаходзіўся засадны полк, які ўзначальвалі князь Уладзімір Серпухоўскі і яшчэ адзін збеглы з Літвы князь Дзмітрый Карыятавіч Баброк Валынскі.

Перад самай бітвай, не згаворваючыся, браты Альгердавічы прапанавалі вялікаму князю Маскоўскаму перайсці праз Дон і спаліць масты, каб у ратнікаў не было спакусы адступіць з поля боя. «Калі будзем тут, слабым будзе воінства, — растлумачыў сваю пазіцыю Андрэй Полацкі, — калі ж на іншы бок Дона пяройдзем, моцным і мужным будзе». І вялікі князь паслухаўся мудрай парады. Дзмітрый Маскоўскі перадаў свае княжскія даспехі аднаму з баяраў, узброіўся як просты воін і стаў у шэраг простых ратнікаў.

Удар аказаўся страшным. Пачаў «прагібацца» вялікі полк, полк левай рукі — адступаць. Распавядалі, што кроў лілася, як вада, на дзесяць вёрст, коні не маглі ступаць па трупах…

Поводле падання, спачатку сышліся ў двубоі віцязь-манах Свята-Троіцкай абіцелі Перасвет і татарскі батыр Чалубей. Яны абодва загінулі. Аднак Чалубей зваліўся з каня, а Перасвет утрымаўся.

Ну а далей, як і задумаў вялікі князь Дзмітрый, ардынцы вымушаны былі атакаваць у лоб рускія войскі. Удар аказаўся страшным. Пачаў «прагібацца» вялікі полк, полк левай рукі — адступаць. Распавядалі, што кроў лілася, як вада, на дзесяць вёрст, коні не маглі ступаць па трупах…

Дзмітрый Альгердавіч павёў на падмогу сваю конніцу. Але татары ўсё ж такі прарваліся ў тыл рускіх войск і сталі акружаць вялікі полк. Уладзімір Серпухоўскі, вымушаны бяздзейнічаць са сваім засадным палком, горасна наракаў Дзмітрыю Баброку Валынскаму: «Ці доўга нам тут стаяць? Якая з нас карысць? Глядзі, ужо ўсе хрысціянскія палкі ляжаць мёртвыя». Але Баброк Валынскі адказваў, што яшчэ нельга выходзіць з засады, таму што вецер дзьме проста ў твар русічам. Праз пэўны час вецер перамяніўся. «Цяпер час!» — сказаў Баброк, і засадны полк кінуўся на татар.

Гэты ўдар вырашыў зыход бітвы. Татар ахапіла паніка. Полк правай рукі Андрэя Полацкага і рэшткі вялікага палка перайшлі ў наступ. Ардынцы былі разбітыя!

З вялікай славай вярнуліся пераможцы ў сем'і свае. А князя Дзмітрыя Іванавіча пасля гэтай перамогі сталі называць Дзмітрыем Данскім.

А ў 1387 годзе Маскву асадзіў татарскі хан Тахтамыш. Праз тры дні ён узяў горад і ператварыў яго ў пажарышча. Дзмітрый Іванавіч плакаў на развалінах Масквы і пахаваў забітых на ўласныя грошы. Атрымаўшы сур'ёзную кантузію на полі Куліковым, Дзмітрый Данскі памёр ад яе вынікаў у 1389 годзе.

Уладзімір Серпухоўскі адмовіўся ад сваіх правоў на Маскоўскі сталец на карысць сына Дзмітрыя Данскога Васілія І.

Лёс Андрэя Альгердавіча склаўся драматычна. Кулікоўская бітва праславіла яго і выклікала чорную зайздрасць Ягайлы. Тым больш, што сам Ягайла збіраўся далучыцца да Мамая, але не паспеў прывесці войска на поле бою.

Даведаўшыся пра тое, што Ягайла згадзіўся стаць польскім каралём, далучыць Вялікае Княства Літоўскае да Польшчы і садзейнічаць распаўсюджванню каталіцтва на праваслаўных землях Беларусі, Андрэй вярнуўся на радзіму і, зноў абвясціўшы сябе вялікім князем Літоўскім, павёў барацьбу за правы адзінаверцаў. Але пацярпеў паражэнне і некалькі гадоў правёў у цямніцы. Слава князя была такой вялікай, што Ягайла не рашыўся яго забіць.

Толькі ў 1394 годзе дзякуючы просьбе Вітаўта праслаўлены вязень быў вызвалены. Некаторы час Андрэй служыў князю Вітаўту, які паручыўся за яго. А потым, у 1399 годзе, вымушаны быў прыняць удзел у няўдалым паходзе Вітаўта на Арду. Князю Андрэю было ўжо семдзесят пяць гадоў. Ён прагнуў спакою, ціхага, малітоўнага заканчэння жыцця. Але Вітаўт настойваў, каб герой Кулікоўскай бітвы ў гэтым паходзе быў побач з ім. На рацэ Ворскле князь Андрэй біўся ў першых шэрагах з воінствам хана Цемір-Кутлука. І загінуў, затрымліваючы татар, каб даць магчымасць рэшткам раці Вітаўта адысці з поля боя.

Там жа, ля водаў крывавай Ворсклы, скончыўся жыццёвы шлях князя Дзмітрыя Альгердавіча. Як і князю Андрэю, яму давялося зведаць цяжкасці заключання на радзіме. Пасля пераможнай Кулікоўскай бітвы Дзмітрый Альгердавіч атрымаў у дадатак да сваіх земляў Ноўгарад-Северскі. Аднак, за год да смерці Дзмітрыя Данскога, вырашыў прынесці васальную прысягу Ягайлу, які стаў польскім каралём. Пэўна, Дзмітрый Альгердавіч спадзяваўся на атрыманне з Ягайлавых рук намесніцтва ў землях Вялікага Княства Літоўскага. Аднак, намеснікам стаў другі ягоны брат па бацьку Скіргайла Альгердавіч. У 1391 годзе тэўтонскі грасмейстар Мальбарг заняў Гродна і Ліду. Скіргайла заклікаў Дзмітрыя Альгердавіча ісці супраць нахабнага крыжаносца. Ім удалася вызваліць захопленыя гарады, і Дзмітрый атрымаў у княжанне Ліду. Аднак ужо ў 1392 годзе яго выгнаў адтуль грасмейстар Руменгейм.

Першая жонка Дзмітрыя Альгердавіча памерла, ён ажаніўся ў другі раз з разанскай князёўнай Анастасіяй Алегаўнай, якая нарадзіла яму сына Фёдара і дачку Алену. Але дарэмна разлічваў на дапамогу родзічаў жонкі ў вырашэнні асабістых праблем князь Дзмітрый. Ліда была чарговы раз вызвалена, але без удзела князя Дзмітрыя. І Ягайла аддаў яе ва ўладанне Вітаўту.

А пасля Вітаўт стаў і Вялікім князем Літоўскім. І ён вылучыў Дзмітрыю ў княжанне Навагрудак. Не згадзіўся з гэтым горды Альгердавіч. Пайшоў адваёўваць сабе страчаную Ліду. Але быў разбіты і патрапіў у палон. Павініўся, адкупіўся, атрымаў волю. У 1393 годзе зноў княжыў у Ноўгарад-Северскім, адмовіўшыся плаціць Вітаўту даніну, бо «Ноўгарад-Северскі заўжды Маскоўскай вотчынай быў». Аднак не далі Вітаўт і Ягайла забыцца дзёрзкаму родзічу пра васальную прысягу. Быў ён зноў паланёны і кінуты ў віленскую цямніцу. Вітаўт вярнуў яму волю толькі дзеля таго, каб выкарыстаць воінскія здольнасці князя Дзмітрыя ў баі з татарамі. Разам з сынамі, Іванам і Андрэем, прыйшоў Дзмітрый Альгердавіч пад сцягамі Вітаўта на Ворсклу. Усе трое засталіся ляжаць на полі бою мёртвымі…

Жыццё — праходзіць, слава — ззяе праз стагоддзі пуцяводнай зоркай. Героі загінулі, але засталіся назаўжды ў памяці нашай, дзякуючы пяру летапісца і яркім радкам славутай сярэднявечнай паэмы «Задоншчына»: «Сыны Літвы храбрыя, крэчаты ў ратны час і палкаводцы праслаўленыя, пад гукі труб іх спавівалі, пад шлемамі песцілі, з вострага мяча ўспоеныя ў Літоўскай зямлі»…

Літаратура, падарожжы і медыцына: загадкавая гісторыя Саламеі Пільштыновай

Марыя КОМЛІК

Пра Саламею Пільштынову (яна ж Русецкая, Гальпірава, Макоўская) мы праз амаль трыста гадоў пасля яе смерці ведаем толькі тое, што яна сама дазволіла нам ведаць.

Ніхто так і не можа здагадацца, адкуль і калі яна з'явілася і куды знікла.

Саламея Пільштынова нарадзілася каля 1718 года (дакладная дата невядомая) у



Навагрудку, атрымала даволі сціплую адукацыю і з дзяцінства цікавілася стральбой. Маладой дзяўчынай выйшла замуж за лекара Якуба Гальпіра, разам з якім у хуткім часе пераехала ў Стамбул. Саламея, авантурная і няўрымслівая ад прыроды, пачала дапамагаць мужу ў працы і хутка сама навучылася лекаваць спачатку хваробы вачэй, а пазней і ўнутраных органаў, што прынесла ёй вялікую папулярнасць і не аднойчы выратоўвала жыццё.

Узнікае пытанне: як у абсалютна патрыярхальнай мусульманскай краіне ў XVIII стагоддзі іншаземка атрымала афіцыйны дазвол займацца лекарскай практыкай нароўні з мужчынамі? Адказ просты: па мусульманскіх звычаях мужчына, нават лекар, не мог наведваць гарэмы, а прававерныя мусульманкі не мелі права лекаваць мужчын. Саламея ж як прадстаўніца іншай рэлігіі магла свабодна працаваць з любымі пацыентамі.

Нягледзячы на адносную верацярпімасць у краіне, іншаземцам працаваць у вялікіх гарадах часам было небяспечна. Аднойчы да Саламеі прыйшлі два янычары, пераапранутыя ў жаночае адзенне і захінутыя чадрой, і папрасілі лекарку пайсці з імі да хворай маці ў суседні раён горада, нават збіраліся аплаціць дарогу. Саламея адмовілася, бо на двары ўжо чакаў вазок, каб везці яе да іншага пацыента. У гэты момант падышла жанчына, што жыла побач, жонка лекара-яўрэя Эбеулу, і пачала распавядаць пра свой досвед у лячэнні хвароб, якога Саламеі нібыта не ставала, і згадзілася дапамагчы янычарам. Паводле турэцкай традыцыі, апрануўшы самыя дарагія ўпрыгожанні, жанчына паехала разам з салдатамі. Пазней яе знайшлі забітай і без каштоўнасцяў.

Саламеі часта даводзілася граць ролю своеасаблівай міс Марпл і самастойна шукаць выйсце з заблытаных жыццёвых сітуацый, абапіраючыся выключна на ўласны розум, уважлівасць да дэталяў і непераможнае жаданне данесці да людзей праўду (так, як яна яе разумела). Так, аднойчы, калі яе муж лячыў аднаго вельмі важнага і заможнага чалавека, той неўзабаве памёр. Сям'я памерлага збіралася ісці да султана з патрабаваннем пакараць лекара смерцю. Саламея з дапамогай грашовай кампенсацыі ўгаварыла сваякоў не спяшацца з рашэннем. Выйграўшы час, Саламея высветліла, што пры прыгатаванні лекаў прысутнічаў канкурэнт яе мужа — доктар Фансека. Не жадаючы трапіць у рукі турэцкага суда, аднаго з самых жорсткіх і прынцыповых у свеце, доктар згадзіўся выплочваць кампенсацыю замест Гальпіра і з'ехаў з краіны.

Авантуры, небяспечныя і часам неверагодныя, суправаджалі Саламею і за межамі Асманскай імперыі. Акрамя роднай Рэчы Паспалітай, яна наведвала еўрапейскія краіны і Расію. Пасля заўчаснай смерці Якуба Гальпіра Саламея некаторы час працавала пры двары Міхала Казіміра Рыбанькі і Францішкі Уршулі Радзівіл. Пазней лекарка пераехала ў Расійскую імперыю, дзе сябравала з Ганнай Іванаўнай — імператрыцай з дынастыі Раманавых.

У той час быў папулярны даволі спецыфічны спосаб заробку — перапродаж ваеннапалонных. Аднойчы Саламея сустрэла пяцярых аўстрыйцаў, паланёных туркамі, выкупіла іх і даслала кожнай з пяці сем'яў ліст, у якім запэўніла, што палонныя знаходзяцца ў добрых умовах і змогуць вярнуцца на радзіму, калі іх родныя дашлюць пэўную суму грошай. Лёс мае добрае пачуццё гумару: чатыры сям'і заплацілі выкуп, а вось пяты палонны — Юзаф Фартунат дэ Пільштын (Піхельштэйн) — напэўна, быў не вельмі патрэбны сваякам, бо так і застаўся з Саламеяй і ў хуткім часе стаў яе другім мужам. Пазней наша авантурыстка цяжарная выправіцца праз Альпы ў Вену, каб знайсці бацькоў мужа, і, як можна здагадацца, абавязкова іх знойдзе.

Сваё багатае на здарэнні і цуды жыццё Саламея Русецкая апісала ў мемуарна-прыгодніцкім рамане, які ў лепшых традыцыях эпохі барока мае доўгую і прыгожую назву: «Пададзенае свету рэха заняткаў, падарожжа і жыцця майго авантураў на чэсць і хвалу П[ану] Богу, у Святой Тройцы Адзінаму, і Найсвяцейшай Маці Хрыста, Пана майго, і ўсім святым». Рукапіс твора, які цяпер знаходзіцца ў Кракаве, суправаджаецца прадмовай «Да ласкавага чытача», у якой аўтарка паведамляе цікавыя падрабязнасці пра напісанне твора:

«... хіба што дзеля таго, каб іншыя, якія ведалі мяне, не дакаралі, што я [...] усе мае тысячовыя пацехі пакінула, а сама адна ў чужы край без усялякае дапамогі і пацехі выправілася, каб жыць і памерці ў Бозе ў тым краі. Вось таму і хачу ў гэтай маёй кніжачцы паказаць пуціны майго жыцця і пакутаў. Крыўды, пагарды ад мужоў, дзяцей, і блізкіх, і лёкаяў маіх — яны выгналі мяне з Айчыны маёй, дык мілей мне тут жыць, у гэтай пустэльні, у спакоі, у ласцы Божай, чым у Польшчы».

Захавалася таксама прысвячэнне Людвіцы Патоцкай, жонцы вялікага гетмана Кароны Юзафа Патоцкага, падпісанае аўтаркай — Рэгінай Саламеяй Макоўскай. З тэксту прысвячэння вынікае, што яснавяльможная Пані і Дабрадзейка (так да яе звяртаецца Саламея) планавала выступіць мецэнаткай і дапамагчы з публікацыяй твора. Аднак з невядомых прычын рукапіс, на жаль, заставаўся ненадрукаваным цягам двухсот гадоў.

Мемуары абрываюцца ледзь не на паўслове, і нам застаецца толькі здагадвацца, чаму так адбылося. Можа, аўтарка вырашыла больш не распавядаць пра сваё жыццё? Ці, як марыла, паехала вандраваць у Палесціну, а дзённік так і застаўся ляжаць на стале? Ці, дапісаўшы апошнія словы, лекарка адправілася ў падарожжа, якое не мае ні пачатку, ні завяршэння?

А можа, уся гэтая гісторыя — толькі фантазія, што ўзнікла ў галаве вандроўнага палкоўніка артылерыі Іаана дэ Вітэ, сярод запісаў якога і быў знойдзены твор?



Вечнасці не прамінуць

Наапет КУЧАК

Наапе́т Куча́к — армянскі паэт XVI стагоддзя. Адзін з першых армянскіх ашугаў (паэтаў-песняроў). Нарадзіўся ў паселішчы Хараконіс, каля Вана (на ўсходзе Турцыі). Дакладныя даты нараджэння і смерці невядомыя (памёр прыкладна ў 1592 годзе).

Пісаў айрэны — песні-чатырохрадкоўі пра каханне і чалавечае быццё.

***

Маю мілосць берагла
Ты — й навокал зелень была.
Наўкола быў снег і лёд,
калі ад мяне ты сышла.
Як вернешся ты сюды,
табе стану морам святла,
бы сонца сагрэю цябе,
панішчу ўсе сцюжы датла.

***

Быў я з тых птушанят,
што з зямлі не бралі прагна зярнят.
Каб кахання сілкі
абысці, я ў неба мкнуў наўздагад.
Ды па моры мілосць
тут і там іх расставіла шмат.
Іншых — лапкі ў сілках,
я ж увесь там — і выберуся наўрад.

***

Каханне ў сэрцы маім —
дрыготка ў асеннім лісці.
Слязам праліцца з мяне —
бы ўвесну залеве прайсці.
Пакуль я ўсё ж пры жыцці,
у дом свой, малю я, пусці!
Як жыць без ласкі тваёй?
Скажы ж, да каго мне пайсці!?

***

Учора на двор зірнуў:
вялі там дзяўчыну адну.
Відаць, спакусілі яе —
грашыма ці то праз ману.
Мілосць хай гарыць агнём,
якой вызначаюць цану.
Каханне належыць браць,
як спелую садавіну.

***

Калі ты здольная, ноч —
як год, гэткай доўгаю будзь.
Каханая вось прыйшла —
і вечнасці не прамінуць.
О ранак, промні святла,
хай нашай гульні не саб'юць:
калі яны свет зальюць,
хай ростані не прынясуць.

***

Нібы храм, твае грудкі:
мае шмат лампад, бялюткі...
Стану ў ім званаром
ютраняў пасля пабудкі,
буду там ля лампад...
— Лепш сыдзі, бо ходзяць чуткі:
храм ахутае змрок,
бо ты легкадумны й хуткі.

***

Чорныя бровы ў цябе,
чорныя пасмы ля скроні.
Бог пакарае, калі
ўночы не прыйдзеш ты сёння.
Прыйдзеш — шчака да шчакі,
ноч правядзём у бяссонні:
нават дыханне тваё
будзе трымаць у палоне.

***

Свой пэндзаль узяў мастак —
пісаў ейны твар і, як
ён бровы ўзнаўляў — няўзнак
быў страціў прытомнасць, бядак.
Хто твор мастака пазнаў,
захоплены быў. Як, аднак,
я Боскі твор пакахаў —
пляткарылі людзі ўсяляк.

***

На золку было чуваць,
як унізе вада цурчыць,
а голас яе, як плынь,
так працягваў міла цячы...
Нягеглы той сярод нас,
хто, каб жарсць сваю зберагчы,
пацалаваўшыся раз,
чакае наступнай начы.

Пераклаў з армянскай мовы
Лявон БАРШЧЭЎСКІ

«Беларусалім. Сэрца святла»

Як пісалася гэтая кніга?

Гэтай вясной Павел Севярынец атрымаў сем гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Падчас шматдзённага судовага працэсу ён прынцыпова маўчаў. Толькі ў сам дзень абвяшчэння прысуду, калі ў будынак урэшце пусцілі журналістаў і сваякоў, «завёў» залу, стоячы за кратамі: «Верым! Можам! Пераможам!».

Маўчаў ён і да суда, адмаўляючыся даваць паказанні на допытах. А калі ў яго запатрабавалі адказу, то заявіў: «Я ўжо ўсё сказаў у сваіх кнігах».

Кніг у Паўла, і праўда, шмат. Галоўная з іх — «Беларусалім». Тры часткі рамана, у якім зло і дабро змагаюцца за Беларусь і ў сэрцах саміх беларусаў. Павел пісаў гэтую кнігу пятнаццаць гадоў, з 2005-га па 2020-ы.

Зрэшты, яна магла да нас і не дайсці.

Умовы, у якіх ствараўся раман, былі самыя розныя: СІЗА КДБ; «хімія» ў Малым Сітна, дзе Павел адбываў першае пакаранне; затым, праз некалькі гадоў, — «хімія» ў Купліне. Вядома, усё пісалася ад рукі, на аркушах паперы, у адным асобнiку. Аднойчы, пры чарговым ператрусе, увесь чарнавік рамана — сотні старонак — канфіскавалі. Здавалася, кніга згубленая. Але, пасля міжнароднага заступніцтва, улады ўсё-такі вярнулі рукапіс.

Другі раз канфіскоўвалі, калі Павел сядзеў на Акрэсціна. «Рукапіс забралі, нягледзячы на мае пратэсты, — пісаў Павел у заяве ў Генеральную Пракуратуру. — У той жа дзень я напісаў заяву на імя начальніка ЦІП, якую перадаў дзяжурнаму на праверцы. Адказу на сваю заяву я так і не атрымаў. Больш таго, на наступнай праверцы супрацоўнікі ЦІП дэманстратыўна раскідалі аркушы белай паперы з маіх рэчаў па ўсёй камеры і патапталіся па іх ботамі».



Аддалі канфіскат (цалкам нечакана) толькі падчас наступнай Паўлавай адсідкі.

Другая частка рамана «Беларусалім», якая называецца «Сэрца святла», была надрукаваная ў чэрвені 2020 г. Прэзентацыя прайшла без аўтара. На той час Павел ужо амаль месяц як знаходзіўся ў турме.

Пра што «Беларусалім»?

Перадусім гэты раман — пра беларусаў і іх гістарычнае пакліканне. Хрысціянскае бачанне свету мае на ўвазе, што гэты свет не бессэнсоўны. Ён — рацыянальны. Усё, што створана, створана для нечага, мае мэту, і ва ўсім ёсць сэнс. Праз свой раман Павел асэнсоўвае пакліканне беларускага народа і дзеліцца разуменнем гэтага паклікання.

Яшчэ гэта кніга пра закаханасць у Бога і пяшчотную любоў да Беларусі. «Закаханасць у Бога?» — здзівіцца хтосьці. Так. Гарачая, эмацыйная закаханасць, што прыходзіць да любога чалавека, які перажывае «сустрэчу з Богам». Кожны вернік ведае, што патлумачыць гэты стан настолькі ж складана, як патлумачыць, што такое першае каханне таму, хто ніколі ні ў каго не закахаўся.

«Беларусалім» — кніга пра тое, якой бы Павел хацеў бачыць беларускую рэвалюцыю духу, нацыянальнае і хрысціянскае абуджэнне народа. Пра тое, якімі шляхамі да нас можа прыйсці перамога. Зрэшты, шлях толькі адзін, падабаецца гэта каму ці не. Без следавання гэтым шляхам усё, што робіць чалавецтва, заўсёды, без выключэнняў, пераўтваралася ў вычварэнне.

Чым раман адметны?

Бываюць кнігі, якія пішуцца «па гарачых слядах». А гэтая напісаная яшчэ да таго, як самі сляды з'явіліся.

Натоўпы людзей у светлых вопратках і чорнае адзенне карнікаў; званы катэдральнага касцёла, які вітае шматтысячнае шэсце пад БЧБ; дваровыя мерапрыемствы; сутычкі з АМОНам; катаванні зняволеных і смерць у турэмных камерах; канспірацыя, ліхтарыкі (у кнізе — свечкі) у вечаровых вокнах дамоў; слова «беларусы», якое вучыць Еўропа. Актыўны ўдзел царквы ва ўсім Беларуху. Вялікія гарады і маленькія мястэчкі абуджаюцца. Лідары гэтага абуджэння, каб пазбегчы арышту, вымушаны эміграваць у Вільню... Усё, што мы перажылі са жніўня 2020-га, — у кнізе, якая выйшла ў чэрвені 2020-га.

Павел у сваім лісце з Валадаркі пісаў мне, што для яго самога гэта быў раман-адкрыццё. «Карціны, якія ажываюць — гэта не "вылічанае" прадбачанне: улетку-увосені 2020 мяне самога агаломшылі дзясяткі супадзенняў».

Пішучы, аўтар глядзеў у сэрца народа. Прычым народ для яго — не проста «насельнікі Рэспублікі Беларусь», а нашмат шырэй: усе тыя, хто жыў тут ад пачатку пісьменнасці і дзяржаўнасці.

Падзеі ў рамане — гэта пераплеценне евангельскай гісторыі з гісторыяй Беларусі. І цячэнне гэтай гісторыі мацнейшае за саміх герояў. Кожны з іх застаецца вольным у сваім асабістым выбары, ад кожнага з іх залежыць, што яны абяруць: Святло альбо Цемру. Героі вызначаюць хаду кніжнага наратыву. Але ніхто і нішто не можа змяніць хаду наратыву гістарычнага. Над усім ёсць Бог, і Ён — адзіны сапраўдны творца гісторыі.

Чаму «Беларусалім» трэба прачытаць?

Вось тры пункты (вядома, іх больш), якія я адзначыў для сябе:

1. Кніга, якая не пакідае раўнадушнай. Яе будуць альбо ганіць, альбо хваліць. Прамаўчаць пра яе вельмі складана.

2. Надзвычай якасная, жывая мастацкая проза.

3. Раман натхняе задумацца пра Бога.

За першую кнігу Паўла Севярынца некаторыя крытыкавалі, што надта ўжо там выразна ўсё падзеленае на чорнае і белае. Маўляў, у жыцці так не бывае, павінна быць і пяцьдзясят адценняў шэрага. Наш час, які абвастрыў кантрасты, паказвае, што на гістарычных пераломах, калі святло ззяе асабліва зырка, шэрае знікае.

Чаго чакаць далей?

Перадусім, чакаем вызвалення Паўла Севярынца з турмы.

Пасля гэтага — выхаду трэцяй, фінальнай часткі «Беларусаліму». Яна ўжо дапісаная. На «Валадарцы» аўтар увесь апошні год працаваў над рэдактурай тэксту.

Чакаем, безумоўна, што прыйдуць перамены.

Чакаем, што раман будуць чытаць, і гэтыя перамены стануць больш трывалымі.

І зусім не без падстаў чакаем, што гэты раман у нашай нацыянальнай літаратуры застанецца вельмі надоўга. А можа, і на столькі часу, колькі беларуская літаратура будзе існаваць.

Аляксей ШЭІН

Пра «прынца» яўрэйскай паэзіі

М. А. Шэпелевіч, Б. Е. Ерузаліма «"Я сердцем солнца пью нектар". Лейб Найдус. К 130-летию со дня рождения гродненского поэта» (Гродна: ЮрСаПрынт, 2021. — 284 с.)

Заўсёды радасна, калі ў Гарадні выходзіць новая кніга. Гэта сведчыць пра тое, што мясцовы літаратурны працэс жыве. І асабліва значна, калі праз яго адбываецца сувязь мінулых эпох з сучаснасцю.

Мы жывём у складаны і цяжкі час: вакол, не гледзячы на вонкавую весялосць і поспех, багата болю і гора. Краіна праходзіць праз пакутлівы перыяд перамен. У айчыннай гісторыі ўжо былі падобныя старонкі, калі шматлікія войны, як чорныя навалы, пракатвалі па зямлі, руйнуючы жыццё цэлых пакаленняў. Але сціхалі страшныя грымоты і вяртаўся мір пад блакіт крывіцкіх нябёсаў, і толькі вечная памяць захоўвала для нашчадкаў незабыўны боль тых гаротных падзей.

І літаратура — верная сястра чалавецтва, таксама праходзіла праз свой росквіт і заняпад. Загараліся новыя імёны, пісаліся шчырыя творы... і зніклі ў бездані часу, каб застацца там назаўсёды ці нечакана з'явіцца праз стагоддзі і стаць цудоўным адкрыццём для ўсіх аматараў высокага слова.

Калі ў шаноўнага чытача ўзнікне прага здзейсніць вандроўку ў тую сумную даўніну, варта зайсці ў выдавецтва «ЮрСаПрынт» на колішняй Брыгіцкай і ўзяць з паліцы кнігу, прысвечаную творчасці гарадзенскага паэта Лейбы Найдуса. Вы ўбачыце якасны друк, арыгінальны дызайн, архіўныя фотаздымкі і, галоўнае, светлыя ўспаміны пра паэта яго блізкіх і сяброў, крытычныя эсэ, артыкулы і пераклады вершаў на чатыры мовы тагачаснага Памежжа.

Над выданнем працавала цэлая плеяда таленавітых аўтараў і ўкладальнікаў: Марына Шэпелевіч, Беньямін Ерузалім, Эсфір Кірзнер, Альжбета Кеда, Ісроэл Някрасаў, Анатоль Брусевіч, Павел Салаўёў, Андрэй Ціхаміраў і іншыя.


Імя Лейба Найдуса было амаль забытым на Радзіме, зрэдку хто з гарадзенцаў мог адказаць, у чый гонар названая маленькая вуліца ў цэнтры горада. Ідыш, на якой пісаў паэт, знікла, і ва ўсім Нядзямонні не засталося ніводнага носьбіта гэтай мовы, дарэчы, адной з дзяржаўных моў былой Беларускай Савецкай Рэспублікі.

І вось імя і творчасць «прынца яўрэйскай паэзіі», як называе Лейба Найдуса украінская паэтка Валерыя Багуслаўская, вяртаецца з небыцця.

Анатоль Брусевіч у эсэ «Пра месца Лейба Найдуса ў беларускай культурнай прасторы» параўноўвае маштаб яго таленту з Максімам Багдановічам. Пакінем за Брусевічам права на яго параўнанні, бо спадар Анатоль і сам знатны паэт з дасведчаным густам. Пагодзімся з тым, што, безумоўна, трагічнасць лёсу яднае гэтых двух заўчасна памерлых маладых творцаў.

«Яго вершы спалілі фашысты, а магілу знішчылі камуністы», — піша пра Лейба Найдуса Андрэй Адляніцкі. Нагадаем, што з магілай Максіма Багдановіча, на жаль, таксама не ўсё зразумела.

Ад сябе выдзелім са зместу два творы. Гэта ўспаміны пляменніцы паэта Алены Найдус, што акунаюць нас у ціхае жыццё яўрэйскіх мястэчак і нагадваюць прозу Шалом-Алейхэма. І яшчэ гісторыя сямі перакладаў Брусевіча — важны артыкул для ўсіх знаўцаў паэзіі, дзе імя Лейба Найдуса стаіць побач з імёнамі Віславы Шымборскай, Івана Франко і Аляксандра Блока.



Адразу пасля выхаду кнігі ў Свята-Пакроўскім кафедральным саборы адбылася адна з яе прэзентацый, дзе акрамя многіх выступоўцаў удзельнічаў сямейны дуэт гарадзенскіх бардаў — Паўла і Таццяны Салаўёвых. Спадар Павел і сам прычыніўся да выдання кнігі ў якасці перакладчыка, а Таццяна спявала песні на вершы Лейба Найдуса не толькі ў перакладах, але нават і на ідыш.

А імя паэта жыве, пакуль чытаюць яго вершы.

P. S. Хто-небудзь з амерыканскай дыяспары, калі ёсць такая магчымасць, пазнаёмце «караля рок-музыкі» і лаўрэата Нобелеўскай прэміі Боба Дылана, бацькі якога паходзілі з адэскіх і літоўскіх яўрэяў, з творчасцю «прынца» Лейба Найдуса. Можа, паважаны мэтр напіша некалькі новых хітоў?

Павел КАСПЯРОВІЧ

Дар'я Ліс: «У кожнага ёсць тое, што перашкаджае па жыцці»

Паэтка і празаік Дар'я Ліс — чалавек, які моцна любіць жыццё. На гэта яе натхняе роднае Залессе з сядзібай Агінскага. І хоць Дар'я хварэе на спінальную мышачную атрафію (СМА), бар'еры яна ўспрымае не як перашкоды, а як асаблівыя ўмовы яе жыцця. Інваліднасць не замінае ёй займацца творчасцю, журналістыкай і дапамагаць іншым беларусам з такім жа дыягназам.



— Дар'я, Залессе — гэта месца вашай сілы?

— Напэўна, немагчыма жыць у Залессі і не пісаць — карціны або тэксты, любіць кветкі і дрэвы... Так, гэта маё месца сілы. Ды, напэўна, кожны можа сказаць так пра сваю радзіму... Але сюжэты, звязаныя з Агінскім, заўсёды крочаць недзе побач.

— Як пачалі пісаць? Як прыйшлі ў журналістыку?

— Калі я вучылася ў школе, то любіла выпісваць і чытаць розныя дзіцячыя выданні. А ў 5 ці 6 класе напісала экалагічную зацемку ў газету «Раніца»: мяне ўразіў забруджаны лес каля школы. Мяне надрукавалі. Пасля гэтага я стала туды пісаць, удзельнічаць у юнкараўскіх конкурсах. Таццяна Рокаш, карэспандэнтка газеты, прыехала. Пасля пэўны час я друкавалася ў «Новай газеце Смаргоні», пакуль яе не зачынілі-забаранілі, супрацоўнічала з газетай «Свободные новости». Мы пасябравалі з Аляксандрам Уліцёнкам, які сказаў, што ў мяне радыйны голас і мне трэба паспрабаваць сябе на радыё. Так, я паспрабавала працаваць на Радыё «Рацыя», у мяне атрымалася: працую там і дагэтуль.

— А якую адукацыю атрымалі?

— Я паступіла і скончыла БДПУ. І ведаеце, чаму? Бо там быў ліфт (смяецца). На журфаку БДУ мяне адгаварылі да іх паступаць: сказалі, маўляў, хай дзяўчынка атрымае добрую спецыялізацыю, а пасля сабе піша на здароўе. Пасля я адкрыла дапаможнік для абітурыента і разгубілася: варыянтаў шмат, а калі пачынала «ісці ў разведку», то аказвалася, што ці завочнага аддзялення няма, ці вучыцца можна было толькі платна... Гэта быў 1999 год. У выніку паступіла на факультэт беларускай філалогіі і культуры ў БДПУ імя Максіма Танка. Хаця, на цяперашні розум, я паспрабавала б паступіць у БДУ. Але не магу сказаць, што вучыцца мне было кепска. Акрамя мяне на курсе быў яшчэ адзін вазочнік. Аднак для мяне цяжка было ездзіць у Мінск. За ўвесь час, напэўна, толькі аднойчы была на лекцыі. У асноўным ездзіла на іспыты і дні завочніка.

— Ці заўсёды атрымлівалася спакойна казаць пра сваю інваліднасць, як гэта робіце цяпер?

— Ведаеце, з узростам нейкія комплексы пераадольваюцца: пачынаеш успрымаць хваробу як частку сябе. Хвароба — гэта проста ўмовы, у якіх ты вымушаны жыць. Канечне, калі была б магчымасць, я б адмовілася ад такіх умоў. Я люблю вандраваць і займацца журналістыкай. А хвароба, якая звязана з цягліцамі, замінае перасоўвацца. Некалі я жартавала, што хачу ўзяць інтэрв'ю ў людзей, да якіх цяжка дабрацца на інвалідным вазку... Але, магчыма, калі б я адмовілася ад інваліднасці, то ў жыцці прыйшло б нешта больш страшнае. І я не ўпэўнена, што гатова была б заплаціць такі кошт. У кожнага з нас ёсць тое, што перашкаджае нам па жыцці. Але калі мы ад гэтага адмовімся, то з'явіцца нешта больш цяжкае, з чым мы не зможам справіцца.

— Але вынікае, што ўсё адно комплексы былі. Як атрымалася іх пераадолець?

— Напэўна, гэта здарылася тады, калі я пазнаёмілася з людзьмі з падобным захворваннем, якія жывуць паўнавартасным жыццём. Памятаю, я вучылася ў 11 класе, і тады ў мяне яшчэ не было электравазка. Я напісала ў газету ліст з просьбай аб дапамозе. Адразу скажу, што спонсар не знайшоўся. Але я пазнаёмілася з Сяргеем са СМА, які стаў для мяне прыкладам. Ён вучыўся на механіка-матэматычным факультэце, працаваў спартыўным аглядальнікам у газеце, нават катаўся на электраскутары! Я тады пабачыла, што ўсё магчыма. Не баюся казаць пра інваліднасць яшчэ і таму, што гэта своеасаблівы элемент піяру магчымага лячэння для СМА-пацыентаў. Я з'яўляюся актыўным сябрам арганізацыі «Геном». «Геном» — гэта грамадскае аб'яднанне, якое дапамагае людзям з нярвова-цяглічнымі захворваннямі. У ёй я займаюся тэмай дарослых пацыентаў. Мы прасоўваем магчымасці лячэння ў Беларусі, бо на сёння ў нас такой магчымасці няма.

— Якія крокі робіце для гэтага?

— Сёння, калі ты дарослы СМА-пацыент, то твой адзіны шлях — эміграцыя. Але гэта цяжка. За намі нашы сем'і. Калі я з'еду за мяжу, то змагу атрымаць тэрапію. Я думаю пра гэта як пра патэнцыйную магчымасць. Аднак я не магу патрабаваць ад сваіх бацькоў кінуць усё — і паехаць са мной. А адна я не паеду, бо не спраўлюся... Цяпер мы чакаем, ці будзе прынята Міністэрствам аховы здароўя еўрапейская гуманітарная праграма і каго на яе возьмуць. Напрыклад, у Расіі спачатку ўзялі дзетак, а пасля дарослых. Праз год праграма скончваецца, і дзяржаўны бюджэт павінен аплаціць тэрапію. Вы ведаеце, што наш бюджэт не схільны за гэта плаціць, у яго чамусьці іншыя праекты, хаця, у прынцыпе, усё вырашальна. Ёсць пацыенты, якім тэрапія жыццёва неабходна. Я хачу, каб гэтая тэрапія была і ў Беларусі.

— Вы з вялікай павагай кажаце пра сваіх бацькоў. Пэўна, у часы, калі вы нарадзіліся, ім давялося вельмі цяжка...

— Так, ім было цяжка. Тады інфармацыі не было, інтэрнэту — таксама. Яны праспрабавалі ўсё, што маглі. Вазілі мяне па дактарах па многіх рэспубліках былога СССР. Яны, як і я, перфекцыяністы, таму лічылі, што трэба зрабіць усё, што магчыма. Яны ж не ведалі, што гэтая хвароба не лечыцца... Зараз думаю, што лепш яны б зэканомілі гэтыя грошы, і мы час ад часу б ездзілі на мора... Пасля было наступнае пакаленне бацькоў і дзяцей, у якіх ужо быў інтэрнэт, і яны ведалі, што СМА не лечыцца. А цяпер ужо іншае пакаленне, якое ведае, што СМА можна вылечыць, толькі не ў нашай краіне. Я не ведаю, што лепш: хворае дзіця і немагчымасць яго вылечыць ці веданне, што за пару сотняў кіламетраў гэта цудоўна лечыцца, а ты нічога не можаш зрабіць... Або ты застаешся тут, а дзіця праз некалькі гадоў сядзе ў вазок, або ты з'едзеш у Польшчу, будзеш цяжка працаваць, але тваё дзіцё будзе атрымліваць тэрапію. Мне падаецца, што заўсёды лепш, калі ёсць выбар.

— Зацемкі вы пісалі яшчэ ў школе. А вершы?

— Напэўна, вершы я пачала пісаць у студэнцтве, калі закахалася.

— Як з іх «атрымаўся» зборнік?

— Пасля «Плошчы» ў 2006 годзе ў мяне з'явілася філасофска-грамадзянская нізка вершаў. Спачатку яна трапіла ў газету «Наша Ніва». Мясцовыя праваабаронцы тады пазнаёмілі мяне з Аляксандрам Мілінкевічам. Ён нечакана прыехаў у Смаргонь і заехаў да нас у Залессе. Мы паразмаўлялі, і ён прапанаваў выдаць кнігу. Так выйшаў мой зборнік «Вершы і песні Свабоды». Наогул, той год быў вельмі адказным... Мне зрабілі аперацыю на спіне, з'явілася праца на Радыё «Рацыя», выйшла кніга «Вясновы джаз». Атрымаўся такі сапраўдны штуршок да пераменаў пасля некалькіх гадоў застою.

— Што для вас пісьменніцтва?

— Проза і паэзія — гэта спосаб выказаць думкі. Гэта тое, што я люблю рабіць і раблю. Калі ў галаву прыходзяць нейкія сюжэты, то іх трэба ўвасобіць. Калі ты адкідваеш гэтыя сюжэты, пасля кінуць цябе ўжо яны. Са мной так здаралася. Калі нейкая гісторыя «стукне» ў галаву, пажадана зачапіцца за яе і апрацаваць. Ты адкладаеш на потым, бо ў цябе нейкія справы, зараблянне грошай, што таксама важна... Але потым ідэя можа знікнуць.

— Ці стаў выхад кніг для вас стымулам пісаць далей і больш?

— На жаль, не. Я сышла ў іншыя актыўнасці. Я — шалі, мне цяжка выбраць: хапаюся за рознае, а сіл на ўсё не хапае. Я займалася мясцовым грамадскім актывізмам, супрацоўнічала з фондам «Паўночныя Афіны», выдавала бюлетэнь «Залеская талака» і займалася сайтам zalesse.by... Але пасля жніўня 2020 года зноў пачала пісаць вершы. За апошнія гады падзбіралася шмат падзей, якія выліваюцца ў вершы. Гэта проста думкі на паперы, тое, што я адчуваю. Я досыць цяжка перажыла эмацыйна 2006 і 2010 гады і сёлета не хацела «ўлазіць» ва ўсё гэта... У мяне не было на гэта сіл. І ўсё ж не ўтрымала дыстанцыю...

— У вас жыве своеасаблівы правільны боль, які не паралізуе, а штурхае да дзейнасці...

— Па-рознаму здараецца... Гэта ж эмацыйная арэлі.

— Сярод аднавяскоўцаў вы — адна, хто адчувае навакольны свет падобным чынам?

— Я сама не магу зразумець, па шчырасці. Мне падаецца, што цяпер дайшло да многіх людзей. Аднак усё адно ёсць людзі, якія маюць інтэрнэт і выпісваюць незалежную прэсу, а ёсць тыя, хто, маючы столькі магчымасцяў, усё адно глядзіць дзяржаўнае тэлебачанне...

— А Залессе наогул мае безбар'ернае асяроддзе?

— У нас ёсць крамы, ніводнай — безбар'ернай. Але і так не хаджу па крамах, бо люблю анлайн-шопінг, асабліва падчас кавіду. У нас свой дом. Я магу шпацыраваць на электравазку па Залессі, пахадзіць па маёнтку, хоць пандус там не вельмі зручны... Ёсць інтэрнэт, ды і я, напэўна, прывыкла ўжо працаваць дома. Часам хочацца паехаць у Смаргонь у кавярню — у нас ёсць сярод іх некалькі безбар'ерных. Аўтобусы ад нас ходзяць часта, але на вазку на іх не зойдзеш, бо там прыступкі... Так і атрымліваецца, што быццам ёсць магчымасць, і быццам яе няма.

— Ці ёсць нейкія бар'еры, якія перашкаджаюць займацца творчасцю?

— Лянота, хіба (смяецца). У кожнага чалавека ёсць лянота, якую яму трэба пераадольваць, калі ён задумаў цікавы праект. Калі ў мяне баліць спіна, то няма настрою нешта рабіць. Наогул, СМА — гэта тая хвароба, пры якой цягліцы лепш працаваць не будуць. Канечне, ёсць пагаршэнні. Калі прымаць лекі, то прынамсі можаш быць упэўненым, што не трапіш на штучную вентыляцыю лёгкіх і захаваеш тыя рухі, што маеш. У многіх нашых дарослых СМА-пацыентаў ёсць дзеці: гэта здарова — бачыць, як яны растуць... Мяне абмяжоўвае тое, што я жыву ў вёсцы і ў нас недастаткова развіты транспарт у Беларусі, што я не магу ўзяць — і самастойна сесці на цягнік і прыехаць у Мінск... Ёсць бар'еры, якія не магу пераадолець. Я б хацела пажыць у нейкім горадзе пару месяцаў, зладзіць сабе творчую рэзідэнцыю... Але я разумею, што адна не спраўлюся. Я жыву з бацькамі, у якіх таксама праблемы і хваробы. Канечне, каб у мяне была магчымасць, я б хацела жыць самастойна і не навешваць на іх свае праблемы.

— А што вас ратуе?

— Сям'я, сябры, праца, кава, музыка, падарожжы, кнігі, мовы... І, напэўна, тое, што я люблю жыццё.

Вікторыя ЧАПЛЕВА

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by